ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 60 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок конп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -надбавку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Адзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПЯТНІЦА, 27 чэрвеня 1930 г.
№ 148 (3746)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

На вялікім гістарычным рубяжы, пад знакам вялізарнейшых перамог пралетарыяту, у эпоху Днепрабудаў, Магнітагорскаў, Трактарабудаў, саўгасаў-гігантаў і разгорнутага калгаснага будаўніцтва—

АДКРЫЎСЯ XVI ЗЬЕЗД ЛЕНІНСКАЙ ГВАРДЫІ

Няхай жыве зьезд пераможнага сацыялістычнага наступленьня!

Адкрыцьцё зьезду

А 17 гадзіне 16 мінут **на трыбуне зьяўляецца т. Калінін**, спатканы бурнымі воплескамі ўсяе залі. Тав. Калінін вітае дэлегатаў **ад імя Цэнтральнага Камітэту Партыі.** Сваю кароткую ўступную прамову т. Калінін канчае словамі: «Няхай жыве пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва». «Няхай жыве Усесаюзная партыя бальшавікоў і яе XVI зьезд». Уступнае слова **т. Калініна** заглушаецца гучнымі аплёдысмэнтамі. Тав. Калінін абвяшчае XVI зьезд Усесаюзнай камуністычнай партыі адкрытым. Заля агалашаецца магутнымі гукамі «Інтэрнацыяналу».

Зьезд прыступае да канструяваньня сваіх органаў. У прэзыдыум абіраюць 40 чалавек. **Пры агалашэньні імя т. Сталін ўся заля ўстае. Дэлегаты, стоячы, наладжваюць бурную авацыю.**

У склад прэзыдыуму увайшлі: Акулаў, Андрэяў, Арцюхіна, Варэйкіс, Варашылаў, Гей, Галашчокін, Зяленскі, Жданаў, Кабакоў, Кагановіч, Калінін, Калыгіна, Кіраў, Калацілаў, Касіёр Станіслаў, Косараў, Куйбышаў, Ломінадзэ, Мануільскі, Мікаян, Молатаў, Нікалаева, Арджанікідзэ, Пятроўскі, Румянцаў, Рудзутак, Рыкаў, Сталін, Срыцоў, Томскі, Уханаў, Хатаевіч, Чубар, Швэрнік, Шэбалдаяў, Шкіратаў, Якаўлеў, Яраслаўскі, Эйха. У гапровы прэзыдыум зьезду абіраюцца прадстаўнікі зарубежных кампартый.

Зьезд выбірае сакратарыят у складзе 26 чалавек і мандатную камісію.

Члены прэзыдыуму займаюць месцы. **Зьяўленьне т. Сталіна за сталом прэзыдыуму сустракаецца бурнай доўгай авацыяй.** Заля агалашаецца прывітаньнямі і гучнымі аплёдысмэнтамі.

Зьезд зацьвярджае наступны парадак дня:

1) Палітычная справаздача ЦК, 2) Арганізацыйная справаздача ЦК, 3) Справаздача рэвізійнай камісіі, 4) Справаздача ЦКК, 5) Справаздача дэлегацыі УсеКП(б) у ВККІ, 6) Выкананьне пяцігдовага пляну прамысловасьці, 7) Калгасны рух і ўздым сельскае гаспадаркі, 8) Задачы прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд, 9) Выбары цэнтральных установ партыі.

Прамова тав. Калініна

Таварышы! Ад імя Цэнтральнага Камітэту вітаю дэлегатаў **XVI зьезду Усесаюзнай Камуністычнай Партыі (бальшавікоў).**

Пасьля XV зьезду нашай партыі прашло ня многа больш 2½ год. Можна сьмела сказаць, што мінулы пэрыяд быў запоўнены вялізарным рэвалюцыйным зьместам і нябачанай творчай работай. За гэтыя гады, як ніколі, разгарнулася сацыялістычнае будаўніцтва. Я ня маю магчымасьці дэтальна спыняцца на выніках гэтага будаўніцтва, але ў гэтым бадай і няма асаблівай неабходнасьці, бо ў гэтай залі вы заслухаеце адпаведны даклад генэральнага сакратара нашай партыі т. Сталіна, дзе будзе поўнасьцю разгорнуты малюнак нашых дасягненьняў. Але я не памылюся, калі скажу, што работа, праробленая народамі Савецкага Саюзу пад гэгэмоніяй пралетарыяту і кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вялізарна па сваіх маштабах і надзвычай выразна па сваіх яканых паказальніках.

Таварышы, калі ўглядзецца ў калейдаскоп перажываемага моманту, дык мімавольна напрашваецца параўнаньне цяперашняй сапраўднасьці з мінулымі гістарычнымі момантамі, бо гэтым паглыбленьнем лепей можна зразумець, уразумець і ахапіць сутнасьць падзей, якія разгортваюцца.

Са ўсёй сумы важнейшых пытаньняў, якія будуць абгавораны на зьезьдзе, я хачу вылучыць адно, з майго пункту погляду, рашаючае палітычнае пытаньне сучаснасьці, а іменна — пытаньне аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. У 1921 годзе, пры ўвядзеньні нэпу Ленін гаварыў: «мы зараз адступаем, каб потым з разьбегу кінуцца яшчэ далей уперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва». Вось цяпер, таварышы, якраз і наступіў такі момант, калі матар'яльна-тэхнічныя рэсурсы, накопленыя буйной прамысловасьцю, далі магчымасьць камуністычнай партыі і пралетарыяту непасрэдна ажыцьцявіць гэты разьбег. Дзякуючы гэтаму цяпер мы падышлі да вырашэньня праблемы разьвіцьця сельскае гаспадаркі ўжо зусім з іншага боку.

Калі ў пачатку новай эканамічнай палітыкі мы стараліся ў першую чаргу наднімать дробную сялянскую гаспадарку, каб такім шляхам адрадзіць і падтрымаць буйную гаспадарчую прамысловасьць, дык цяпер прамысловасьць, якая бурна разьвіваецца, паварочваецца тварам да сельскае гаспадаркі і кідае свае накопленыя рэсурсы для таго, каб перабудаваць сельскую гаспадарку на пачатках буйной калектывізаванай вытворчасьці. Цяпер наша задача зусім ня зводзіцца да таго, каб проста падняць сельскую гаспадарку. Не. Тут справа ня ў гэтым. Зараз сапраўдны ўздым прадукцыйнасьці сельскае гаспадаркі нямысліма без карэннага ператварэньня вёскі, з якім зьвязана глыбокая сацыяльна-культурная перабудова сельска-гаспадарчых вытворцаў.

Таварышы, калі-б мы пажадалі зараз абагуліць і коратка выказаць тыя вынікі сацыялістычнага будаўніцтва за апошнія 2½ г., дык мне здаецца, што не знайсьці найбольш правільнай, найбольш выразнай формы выяўленьня гэтых посьпехаў, чым лёзунг, які быў упяршыню высунуты т. Сталіным на канфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстых, г. зн. лёзунг аб суцэльнай калектывізацыі сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Мне здаецца, што гэты лёзунг яшчэ ня зусім перавараны ўсімі працоўнымі нашага Саюзу, але ён яшчэ нават поўнасьцю не перавараны шырокімі пластамі нашае партыі. А між тым, таварышы, гэты лёзунг зьяўляецца самым выразным паказальнікам нашых дасягненьняў. Праўда, сёньня ён больш зразумелы, больш арганічна зьвязаны з нашай папітыкай, з практычнымі работамі, чым гэта было ўчора. Заўтра гэты лёзунг яшчэ мацней ўкараніцца ў галовы практычных работнікаў, бо сацыялістычнае будаўніцтва, якое разьвіваецца кожны дзень, падмацоўвае канкрэтнымі фактамі ўсю жыцьцёвасьць і неабходнасьць гэтага лёзунгу.

Таварышы, што значыць суцэльная калектывізацыя? Гэта значыць, што шматмільённыя распыленыя, дробныя тавара-вытворцы, дробныя гаспадарчыні далучаюцца да актыўнага сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта значыць, што да шматмільённай пралетарскай арміі сацыялістычных будаўнікоў далучаюцца дзесяткі мільёнаў будаўнікоў-сялян. А нарэшце, гэта азначае набліжэньне маманту поўнага зьнішчэньня антаганістычных клясаў, паступовага зжываньня клясавай барацьбы праз зьнішчэньне кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Мы яшчэ ня зусім усьвядомілі вялізарную творчую сілу гэтага лёзунгу. Бо гэта-ж ёсьць самае рэльефнае і канкрэтнае выяўленьне магутнасьці нашай прамысловасьці, якое рухае і вядзе ўперад пераможны пралетарыят. І недарма таму ўвесь сьвет з выключнай зацікаўленасьцю сочыць за калектывізацыяй сельскае гаспадаркі, якая разгортваецца ў нас.

Таварышы, калі Ленін высоўваў тое, або іншае палітычнае пытаньне, дык ён звычайна папераджаў, што пытаньне пастаўлена на лязо нажа, што ўхіліцца ад правільнага вырашэньня гэтага пытаньня, нават у нязначай ступені, значыць зрабіць грубейшую памылку. І ў сучасны момант лёзунг «Суцэльная калектывізацыя сельскае гаспадаркі і ліквідацыя кулацтва, як клясы»—г. зн. што ў палітычных адносінах пытаньне пастаўлена на лязо нажа. Таму ад выканаўцаў іх патрабуецца глыбокае разуменьне ўнутранога сэнсу гэтага лёзунгу. Самае нязначнае незразуменьне гэтага лёзунгу цягне да перагібаў, скажэньняў і пазбаўляе нас магчымасьці атрымаць той вынік, які прасьледуецца гэтым лёзунгам.

Калі можна так сказаць, гэтым лёзунгам проста непасрэдна наша партыя пастаўлена перад гіганцкай задачай сапраўднага сацыялістычнага будаўніцтва са ўсім уздымам вялізарнейшых труднасьцяй, якія нясе ў сабе гэтая гістарычная работа, таму ня дзіва, што на глебе практычных цяжкасьцяй чутны асобныя галасы, у якіх адчуваецца баязьлівасьць гэтых цяжкасьцяй, якія шарохаюцца перад намі то ўправа, то «ўлева». Партыя рашуча змагаецца з гэтым шароханьнем. Я не сумняваюся, што зьезд пакончыць з такімі хітканьнямі.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПЕРАМОЖНАЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЎСЕСАЮЗНАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ БАЛЬШАВІКОЎ І ЯЕ XVI ЗЬЕЗД!

Абвяшчаю XVI зьезд партыі адкрытым (доўгія воплескі — усе дэлегаты ўстаюць і пяюць Інтэрнацыянал).

Далей т. КАЛІНІН паведамляе аб тым, што прышлі вітаць зьезд прадстаўнікі рабочай дэманстрацыі і рабочыя дэлегацыі Масквы і інш. гарадоў.

Усе выступаўшыя прадстаўнікі рабочых заяўляюць аб поўным падтрыманьні генэральнай лініі партыі і патрабуюць далейшай непрымірымай барацьбы з найбольш небясьпечным зараз правым ухілам і «левымі» загібамі. Гарачымі аплёдысмэнтамі сустракае зьезд прадстаўнікоў 900.000 калгаснікаў Паўночнага Каўказу і ўдарнага калгасу «Ленінскі Шлях». Бурную авацыю наладжвае зьезд т. Блюхэру, які выступае з прывітаньнямі ад Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Выступае з прывітаньнямі прадстаўнік Чырвона-Сьцяжнага Балтыцкага флёту.

Прывітаньні скончаны. Тав. Калінін абвяшчае пасяджэньне зачыненым.

27 чэрвеня а 10 г. раніцы зьезд прыступіць да заслуханьня ПАЛІТЫЧНАЕ СПРАВАЗДАЧЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ, ЯКУЮ РОБІЦЬ ТАВ. СТАЛІН.

У. І. ЛЕНІН

Праект рэзалюцыі Цымэрвальдзкай канфэрэнцыі

(Жнівень 1915 г.)

Праект рэзалюцыі, напісаны Леніным, прызначаўся для папярэдняга абгаварэньня яго сярод левых дэлегатаў асобных сацыялістычных партый, з тым, каб потым унесьці праект ад імя «левай» на Цымэрвальдзкую канфэрэнцыю.

ІНСТЫТУТ ЛЕНІНА.

Сучасная вайна параджана імпэрыялізмам. Капіталізм дасягнуў гэтай найбольш высокай стадыі. Прадукцыйныя сілы вобчаства і разьмеры капіталу перарасьлі вузкія рамкі асобных нацыянальных дзяржаў. Адсюль — імкненьне вялікіх дзяржаў да падпяволеньня чужых нацый, да захопу калёній, як крыніц сырцу і месц выбазу капіталу. Увесь сьвет зьліваецца ў адзін гаспадарчы арганізм, увесь сьвет падзелены паміж жменькай вялікіх дзяржаў. Абпастыўныя ўмовы сацыялізму зусім пасьпелі і цяперашняя вайна ёсьць вайна капіталістых за прывілеі і манаполіі, якія-б маглі адтэрміновать крах капіталізму.

Імкнучыся да вызваленьня працы ад прыгнечаньня капіталу, адстойваючы сусьветнае брацтва рабочых, сацыялісты змагаюцца супроць усякага прыгнечаньня і нярэўнапраўя нацый. У эпоху, калі буржуазія была прагрэсыўна, калі на гістарычнай чарзе дня стаяла зьнішчэньне фэўдалізму, абсалютызму, чужаземнага гнёту, сацыялісты, будучы заўсёды самымі пасьлядоўнымі і самымі рашучымі дэмакратамі, прызнавалі ў гэтым сэнсе — і толькі ў гэтым сэнсе — «абарону бацькаўшчыны». І ў сучасны момант, калі на ўсходзе Эўропы, або ў калёніях ушчыкла вайна прыгнечаных нацый супроць іх прыгнятальнікаў, вялікіх дзяржаў, сначуваньне сацыялістых было-б цалкам на баку прыгнечаных.

Але цяперашняя вайна параджана зусім іншай гістарычнай эпохай, калі буржуазія з прагрэсыўнай стала рэакцыйнай. З боку абедзьвюх груп ваюючых дзяржаў гэта вайна ёсьць вайна, дзеля вольніка-ўласьніцаў за захаваньне і ўмацаваньне вольніцтва: за перадзел калёній за «права» прыгнятаць чужыя нацыі, за прывілеі і манаполіі вялікадзяржаўнага капіталу, за увекавечаньне наёмнага нявольніцтва шляхам расколу рабочых розных краёў і рэакцыйнага падаўленьня іх. Таму прамовы аб «абароне бацькаўшчыны» з боку абедзьвюх ваюючых груп ёсьць ашукацтва народу буржуазіяй. Ні перамога якой-бы ні стала групы, ні зварот да статус кво ня можа не ахаваць свабоды большасьці нацый міру ад імпэрыялістычнага прыгнечаньня іх жменькай вялікіх дзяржаў, ні забясьпечыць рабочай клясе нават цяперашніх яе скромных культурных заваёў. Эпоха параўнаўча мірнага капіталізму мінула без звароту. Імпэрыялізм нясе рабочай клясе нячуванае абвастрэньне клясавай барацьбы, патрэбы, беспрацоўе, дарагоўлі, уціску трэстаў, мілітарызму, палітычную рэакцыю, якая падніма галаву ва ўсіх, нават самых свабодных краёх.

Сапраўднае значэньне лёзунгу «абароны бацькаўшчыны» ў данай вайне ёсьць абарона «права» «сваёй» нацыянальнай буржуазіі на прыгнечаньне чужых нацый, ёсьць нацыянал-лібэральная рабочая палітыка, ёсьць саюз нікэмнай часткі прывілеяваных рабочых са «сваёй» нацыянальнай буржуазіяй супроць масы пралетараў і эксплёатаваных. Сацыялістыя, якія вядуць такую палітыку, на справе зьяўляюцца шавіністымі, сацыял-шавіністымі. Палітыка галасаваньня ваенных крэдытаў, уступленьня ў міністэрства, Бургфрыдэн *) і г. д. ёсьць здрада сацыялізму. Апартунізм узгадованы ўмовамі мінулай «мірнай» эпохі, дасьпеў цяпер да поўнага разрыву з сацыялізмам і стаў простым ворагам вызваленчага руху пралетарыяту. Рабочая клясна ня можа дасягнуць сваіх сусьветна-гістарычных мэтаў, не вядзучы самай рашучай барацьбы з адкрытым апартунізмам і сацыял-шавінізмам (большасьць с.-д. партый Францыі, Нямеччыны, Аўстрыі; Гайндман, Фабіянцы і трэдюніяністы ў Англіі, Рубановіч, Пляханаў і «Наша Зара» ў Расіі і г. д.), як і з так званым «цэнтрам», які здаў пазыцыі марксызму шавіністым.

Базэльскі маніфэст 1912 г., аднагалосна ўхвалены сацыялістымі ўсяго сьвету, у прадбачаньні іменна такой вайны паміж вялікімі дзяржавамі, якая цяпер наступіла, акрэсьлена прызнаў імпэрыялісцкі, рэакцыйны характар гэтай вайны і заявіў, што лічыць злачынствам, каб рабочыя аднаго краю страляді ў рабочых другога і агаласіў набліжэньне пралетарскай рэвалюцыі іменна ў сувязі з гэтай вайной. І сапраўды, вайна стварае рэвалюцыйную сытуацыю, параджае рэвалюцыйныя настроі і бражэньні ў масах, выклікае ўсюды ў лепшай часткі пралетарыяту сьвядомасьць пагубнасьці апартунізму і абвастрае барацьбу з ім. Узрастаючае ў працоўных масах жаданьне міру выказвае іх расчараньне, крах буржуазнай мапы аб абароне бацькаўшчыны, пачатак праяўленьня рэвалюцыйнае сьвядомасьці мас. Скарыстоўваючы гэтыя настроі для сваёй рэвалюцыйнай агітацыі, ня спыняючыся ў сваёй рэвалюцыйнай агітацыі перад меркаваньнем аб паражэньні сваёй «бацькаўшчыны», сацыялісты ня будуць ашукваць народ надзеяй на магчымасьць хуткага, колькі-небудзь моцнага, дэмакратычнага, выключаючага прыгнечаньне нацый міру, разбраеньня і г. д. без рэвалюцыйнага пазьбяржэньня цяперашніх урадаў. Толькі сацыяльная рэвалюцыя пралетарыяту адкрывае дарогу да міру і свабоды нацый.

Імпэрыялісцкая вайна адкрывае сабой эру сацыяльнай рэвалюцыі. Усе абстэтыўныя ўмовы навейшай эпохі стаўць на чаргу дня рэвалюцыйную масавую барацьбу пралетарыяту. Доўг сацыялістых — не адмаўляючыся ні ад адзінага сродку легальнай барацьбы рабочае клясы, супадпарадкаваць іх усёй гэтай неабходнай і галоўнейшай задачы разьвіваць рэвалюцыйную сьвядомасьць рабочых, згуртоўваць іх у інтэрнацыянальнай рэвалюцыйнай барацьбе, падтрымліваць і рухаць наперад усякае рэвалюцыйнае выступленьне, імкнуцца да абарачэньня імпэрыялісцкай вайны паміж народамі ў грамадзянскую вайну прыгнечаных клясаў супроць іх прыгнятальнікаў, вайну за экспрапрыяцыю клясы капіталістых, за заваёву палітычнай улады пралетарыятам, за ажыцьцяўленьне сацыялізму.

*) Грамадзянскі мір. **Рэд.**

АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВЫХ ФОРМ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПРАЦЫ, ЛІКВІДАЦЫЯЙ ПРАРЫВАЎ У ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ, ПЕРАВЫКАНАНЬНЕМ ПАСЕЎНЫХ ПРАГРАМ—

ФАБРЫКІ, ЗАВОДЫ І КАЛГАСЫ ГАЛАСУЮЦЬ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Пабудова Крычаўскага цэмэнтнага заводу пачата

Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Беларусі

РАБОЧЫЯ, ТЭХНІЧНЫ ПЭРСАНАЛ, ПРАФОРГАНЫ І ВАКОЛЬНАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА, САБРАЎШЫСЯ НА ЗАКЛАДКУ ЦЭМЭНТНАГА ЗАВОДУ Ў КРЫЧАВЕ, ШЛЮЦЬ ПАЛКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ КІРАЎНІКУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ БЕЛАРУСІ — ЦК КП(б)Б. ЗАПЭЎНЯЕМ ЦК, ШТО МЫ ЎПАРТА БУДЗЕМ ІСЬЦІ КРОК ЗА КРОКАМ ПА ШЛЯХУ ПАСЬПЯХОВАГА ВУДАЎНІЦТВА НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, УЗМАЦНЯЮЧЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА. МЫ АБЯЦАЕМ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯНАВАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ПАЛЯПШЭНЬНІ ЯКАСЬЦІ РАБОТ І ЗНІЖЭНЬНІ САБЕКОШТУ. БАРАЦЬБОЙ З УСІМІ ГАСПАДАРЧЫМІ ЦЯЖКАСЬЦЯМІ — ЗАКОНЧЫМ У ТЭРМІН ПАБУДОВУ ЦЭМЭНТНАГА ЗАВОДУ Ў КРЫЧАВЕ.

КАМІСІЯ.

Трамвайная зьме на імя XVI партзьезду

На прадпрыемствах Віцебскага камтрэсту адбыўся рад мітынгаў з шырокім удзелам усіх рабочых. Адна з трамвайных зьмен абвясьціла сябе ўдарнай імя XVI партзьезду і ўзяла на сябе абавязацельства добра адносіцца да мэханізмаў, зьнішчыць прагулы і дабіцца больш інтэнсыўнай работы трамваю. Дэпо трамваю абвясьціла сябе ўдарным абавязаўшыся зьнізіць сабекошт супроць пляну на 2 проц.

8 рабочых прадпрыемстваў Камтрэсту падалі заявы аб жаданьні ўступіць у партыю.

Значная работа разгарнулася сярод сэзоньнікаў. З імі таксама праведзены сходы і мітынгі. Узраслa падпіска на партыйны друк.

ЯЗЭП ЧОРНЫ.

Маскоўскія навіны

(ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШАГА КАР.)

ГРАНДЫЁЗНЫ ПОСЬПЕХ БЕЛДЗЯРЖТЭАТРУ НА АЛІМПІЯДЗЕ

МАСКВА, 25 чэрвеня. Сёньня раніцою ў памяшканьні Маскоўскага мастацкага тэатру адбыўся спэктакль Беларускага дзяржаўнага тэатру спэцыяльна для членаў журы і ўдзельнікаў алімпіяды. Ішла п'еса Лахматага «Гута».

Спэктакль меў вялізарны посьпех. Паасобныя моманты ігры ў часе ходу дзеі перарываліся бурнымі воплескамі. Пасьля кожнае дзеі заслона ўзьнімалася да 10-ці раз.

Пасьля спэктаклю выступаўшыя з ацэнкай члены журы зазначалі, што «Гута» адзін з лепшых спэктакляў алімпіяды і павінен заняць адно з першых месц пры прысуджэньні прэміі.

ЗАГАТОВІЦЬ ТРАКТАРНЫЯ ЧАСТКІ

МАСКВА, 26 чэрвеня. У мэтах забесьпячэньня трактараў запаснымі часткамі ў асеньнюю пасеўную кампанію 1930 г. СНК запрапанаваў ВСНГ СССР безадкладна **даць заказ прамысловасьці на запасныя часткі да трактараў у суме 3.500.000 руб. і Наркамгандлю СССР—прывезьці з-за мяжы на 1.500.000 руб.**

АБСТАЛЯВАНЬНЕ КЛІНІЧНАГА ГАРАДКА

Падрыхтоўчая камісія СНК Саюзу пастанавіла асыгнаваць 265.000 руб. **на абсталяваньне клінічнага гарадка ў Менску.**

НА ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ ВЫСТАЎКУ

Паводле вестак, атрыманых у Саюзсельмашы, машынабудаўнічыя заводы сельска-гаспадарчых прылад пачалі адгрузку экспанатаў для Беларускай выстаўкі.

ДАДАТКОВЫЯ АСЫГНАВАНЬНІ БЕЛАРУСІ

Падрыхтоўчая камісія СНК Саюзу пастанавіла **дадаткова адпусьціць Беларусі па бюджэце 1929-30 г. 3.000.000 рублёў.**

КЛЮБНУЮ РАБОТУ НА ДЗЬВЕ ЗЬМЕНЫ

МАСКВА. **УсеЦСПС** канстатаваў, што **культурна-масавая работа на прадпрыемствах, якія перайшлі на бесьперапынку, пастаўлена нездавальняюча** і запрапанаваў сярэм прафарганізацыям **не пазьней 1 жніўня скончыць перавод усяе клюбнае работы на дзьве зьмены.** На такі-ж парадак работы павінны быць пераведзены стадыёны і ўся культработа.

НКШЗ ДА АСЕНЬНІХ ПЕРАВОЗАК

МАСКВА. **НКШЗ** розгортвае буйныя работы па будаўніцтве другіх шляхоў для таго, **каб павялічыць прапускную здольнасьць чыгунак і гэтым самым забясьпечыць выкананьне праграмы асеньніх перавозак.** У Сібіры ва ўдарным парадку ідуць работы па ўкладзе другіх шляхоў у раёне Карамзіна-Петраўлаўск. Работы павінны быць скончаны не пазьней і кастрычніка. На Урале ўкладаюцца другія шляхі паміж Петраўлаўскам—Чалябінскам і Сьвярдлоўскам—Вяткай. Павінны быць укладзены другія шляхі паміж Чалябінскам і Цімэлем.

Дзесяць такароў-камунараў

„Паколькі сацыялістычныя ідэі ўсе больш аўладоўваюць масамі, яны здольны перарастаць у сацыялістычныя пачуцьці" (Маркс)

Можа быць, што тыя 10 такароў, якія выкінулі лёзунг: «Усе за аднаго, адзін за ўсіх» — ня чыталі тэтых радкоў Маркса.

Усё можа быць. Толькі пачын 10 такароў заводу «Энэргія» — арганізаваць дзьве вытворчыя камуны — выходзіў з самых моцных, самых глыбокіх імкненьняў, якія праяўляюцца толькі ў асяродзішчы пралетарыяту, калі справа ідзе аб клапатлівасьці і адказнасьці за лёс сацыялістычнага будаўніцтва.

«Мы хочам узьняць прадукцыйнасьць працы, зьнізіць сабекошт прадукцыі, зьнішчыць брак, прагулы. Мы хочам дапамагаць адзін аднаму ў гэтай справе» — заявілі камунары. І іх заява стала выклікам для ўсяго такарнага цэху.

Нахіліўшыся кожны над сваім асобным варштатам, робячы кожны сваю асобную работу: «кожны за сябе»—яны бачылі, што павышэньне прадукцыйнасьці працы ўпіраецца ў недахоп інструментаў, што часта прадукцыйнасьць працы зьніжаецца з прычыны агідненькіх прастояў варштатаў. Рабочы, ня зьвязаны з іншым рабочым другой зьмены, канчаў сваю дэталь за 10-15 мінут да гудка. «Ніякага сэнсу няма ад таго, каб рабіць устаноўку, усёроўна дэталь не мая»,—тлумачылі рабочыя свой прагул. І варштаты «гулялі».

За бесьперапынную работу варштатаў і выступілі ў першую чаргу камунараўцы.

У сваім невялічкім статуце камуны—камунараўцы пішуць:

— Усе нарады на работу выпісваюцца на імя вытворчай камуны такароў імя XVI партзьезду.

— Мы поўнасьцю абагульваем свае інструменты, якія хаваюцца ў агульнай скрыні.

— Мы дапамагаем адзін другому ў выкананьні даручанай камуне работы. Другая зьмена працягвае работу, пачатую першай зьменай.

— Работа кожнага камунара — прадукт усяе камуны. За брак адказвае ўся камуна.

— Заработная плата разьмяркоўваецца роўна паміж усімі членамі камуны.

— Мы зьнішчым прагулы, спазьненьні, будзем рыхтавацца да работы за 5 хвілін да яе пачатку. Мы поўнасьцю выканаем прамфінплян, **закантрактуем сябе на заводзе да выкананьня пяцігодкі.**

Другая камуна—Эстэркіна, Новікава, Броцкага, Левіна і Гурэвіча арганізавалася на тых-жа вытворчых прынцыпах, толькі з наступнай зьменай:

— Камуна мае агульны разьлікавы ліст. Заработная плата разьмяркоўваецца адпаведна разраду кожнага камунара.

Паўней, гэтыя таварышы арганізавалі вытворчы калектыў. Але як адна, так і другая група камунараўцаў ведала адно: кожная новая ўдарная брыгада, новая вытворчая камуна, вытворчы калектыў, кожны пачын антузіязму рабочае клясы — самы моцны ўдар па правых і «левых» капітулянтах, якія імкнуцца сарваць нашу вялікую будоўлю. І адсюль, у адзнаку шчырай адданасьці сваёй справе, яшчэ больш шчыльнай згуртаванасьці вакол ленінскай партыі — 10 такараў «Энэргіі» назвалі абедзьве камуны **імя XVI партзьезду.**

Так варштаты 32 і 33, 68 і 69 уключыліся ў паток заводзкай дзейнасьці, як **камуністычныя варштаты.** Гэтым яны дабіліся магчымасьці бесьперапыннай работы, абагульненьня інструментаў, самага лепшага самакантролю. Гэтым яны дабіліся вялікага павышэньня прадукцыйнасьці працы, вялікага вытворчага эфэкту.

С.

Ні кроку ад генэральнай лініі партыі

Агульны сход рабочых і служачых фабрыкі **«Камунарка»** шле шчырае пралетарскае прывітаньне XVI зьезду бальшавіцкае партыі.

Мы абяцаем перавыканаць прамфінплян і запэўняем УсеКП(б), што будзем упарта праводзіць у жыцьцё ўсе пастановы зьезду, вядучы бязьлітасную барацьбу са ўсякімі праяўленьнямі капітулянцтва і панікерства.

Ні кроку ад генэральнай лініі партыі!

Няхай жыве XVI зьезд бальшавікоў.

Няхай жыве правадыр УсеКП(б)—т. **Сталін!**

Фабрыку „Праца"— на „грамадзкі буксір"

ГОМЕЛЬ (НАШ КАР.). Арганізацыі швэйнай фабрыкі «Камінтэрн», якая занесена на чырвоную дошку газэтамі «Полесская Правда» і «Аксцябр», узялі на «грамадзкі буксір» абутковую фабрыку «Праца», якая сыстэматычна недавыконвае свой прамфінплян.

На абодвух фабриках вакол пытаньня арганізацыі «грамадзкага буксіру» разгортваецца вялікая работа. Сёньня рабочыя фабрыкі «Камінтэрн» арганізуюць спатканьне з рабочымі фабрыкі «Праца» для абгаварэньня практычных мерапрыемстваў па арганізацыі «грамадзкага буксіру». На фабрыцы «Каминтэрн вылучана спэцыяльная буксірная брыгада.

Яшчэ больш згуртуемся вакол Ленінскай партыі

Сход рабочых ф-кі «АДРАДЖЭНЬНЕ» ў аднагалосна прынятай рэзалюцыі заяўляе:

У дзень адчыненьня XVI зьезду УсеКП(б) мы яшчэ больш згуртуемся вакол ленінскай партыі для выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады. Мы абяцаем весьці рашучую барацьбу з праяўленьнямі ўсяляких ухілаў ад генэральнай лініі партыі. Таксама абяцаем падняць вытворчасьць працы на яшчэ вышэйшую ступень і весьці самую барацьбу з прагулмі.

На гэтым-жа сходзе 15 рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

Жыцьцё дашчэнту разьбівае прароцтвы апартуністых

«Наш калгас да 15 чэрвеня скончыў сяўбу. Плян пасеўнай кампаніі выканан. Пры разглядзе тэзісаў тав. Якаўлева калгаснікі пстанавілі засеяць звыш пляну 2 гэкт. у падарунак XVI партзьезду». Так рапартуе XVI зьезду **калгас «Прамень Сацыялізму»,** Сіроцінскага раёну. У рапарце калгаснікі запэўняюць партыю, што яны на справе давядуць індывідуальным гаспадаркам пераважнасьць буйной гаспадаркі перад дробнай.

Калгас «Рэвалюцыя» ў Быхаўскім раёне, Магілеўскай акругі, паведамляе, што веснавая сяўба скончана яшчэ 24 мая. Калгас прыступіў да засеву незасеянай плошчы індывідуальнага сэктару і дапамагае сем'ям беднаты. Насеньне ачышчана на 100 проц. Уся плошча яравога кліну закантрактавана. Выканан да тэрміну дагавор па сацспаборніцтве з калгасам імя Сьвярдлова.

Калгас **«Новае Жыцьцё» Чашніцкага раёну** рапартуе, што плян веснавой сяўбы перавыкананы на 18 проц. За лік распрацоўкі аблогаў і бросавых зямель павялічана зямельная плошча. Плян засеву ільну перавыкананы на 21 гэкт. У мэтах лепшай падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі калгаснікі **абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя XVI партзьезду.**

З калгасу «Культура» Лёзьненскага раёну паведамляюць, што плян веснавой сяўбы перавыкананы на 13 проц.

Кантрактацыя праведзена поўнасьцю. У падарунак XVI партзьезду калгас засеяе 2 гэктары ільну. Калгаснікі абяцаюць партыі па-ўдарнаму правесьці ўборачную кампанію.

Калгаснікі «Пурылёва» Сеньненскага раёну ў рапарце шчыра вітаюць XVI зьезд, запэўняюць партыю, што пад яе кіраўніцтвам яны будуць змагацца за перабудову сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад. Веснавая сяўба ў калгасе скончана на 8 дзён раней тэрміну—плян засеву аўсу перавыкананы на 40 гэкт., ільну—на 3 гэкт., ячменю—на 2 гэкт. Закантрактавана палова пасеву.

Калгаснікі пастанавілі зараз-жа пачаць падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю —адрамантаваць увесь інвэнтар, абсталяваць памяшканьне для сеўшкі насеньня.

Члены **калгасу «Пралетарская Перамога»** Барысаўскага раёну ў рапарце пішуць, што калгас раскінут на былых прыпчэпаўскіх пасёлках, перавыканаў плян пасеўнае кампаніі на 28,3 проц. Усе пасеньне ачышчана і пратручана. За лік аблог і папару пашырана на 15 гэкт. пасеўная плошча. Калгас аказаў дапамогу калгасу «Бальшаўнік» і тром бяднацкім гаспадаркам. Па сканчэньні пасеўнай кампаніі адбыўся масавы сход калгаснікаў, на якім абгаварваліся вынікі пасеўнай кампаніі.

Зараз калгаснікі рыхтуюцца да ўборкі—створаны брыгады па рамонце інвэнтару.

У калгасе арганізаваны дзіцячыя яслі на 30 чал. і пляцоўка на 35 дзяцей.

**У калгас паступілі ў апошні час 4 заявы беднякоў і сераднякоў аб прыёме іх у лік калгаснікаў.

ВЫРВЕМ т. т. ГІРША, ЮГЭНДА і ПРОПЕРА З КІПЦЮРОЎ ФАШЫСЦКІХ ВЕШАЦЕЛЯЎ

Львоўскі прыгавар—гэта адказ польскага фашызму на ўзрастаючы рэвалюцыйны рух і сыгнал да ўзмоцненай падрыхтоўкі контррэвалюцыйнай антысавецкай вайны

ПРАЦОЎНЫЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ ПАТРАБУЮЦЬ НЕАДКЛАДНАГА СКАСАВАНЬНЯ КАТАЎСКАГА ПРЫГАВАРУ

Фашызм рыхтуе шыбеніцу

Львоўскі прыгавор, паводле якога трох падсудных т. т. **Пропер, Югэнт і Гірш** — прысуджаны да пакараньня сьмерцю за пашырэньне камуністычнай адозвы, кідае яскравае сьвятло на крызіс фашысцкай дыктатуры Польшчы, які ўсё больш паглыбляецца. **У рабоча-сялянскіх масах, сярод прыгнечаных польскім імпэрыялізмам народаў усё больш узрастае рэвалюцыйны рух.** Нездаваленьне ахапляе ўсё больш шырокія колы дробнай буржуазіі. Узмацняюцца церці ў фашысцкім лягеры. Фашысцкая дыктатура шукае выхаду з гэтага тупіку шляхам узмоцненага тэрору, шляхам паскарэньня падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

Фашызм прабуе шабляй, куляй і турмою запалохаць працоўныя масы, ламаць узрастаючы рэвалюцыйны рух.

Рабочыя прымушаны ў часе кожнай забастоўкі або выступленьня беспрацоўных змагацца з траістым блёкам—капіталістых, сацыял-фашысцкай бюракратыі і фашысцкай дзяржавы, які прабуе пры дапамозе паліцыі, узброенай паводле апошняга слова вайсковай тэхнікі, ламаць змаганьне пралетарыяту. Усё больш узмацняюцца рэпрэсіі супроць сялян.

Узмацняецца тэрор супроць нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі і ў Заходняй Украіне. Сыстэматычна разграмляюцца беларускія і украінскія радыкальныя культурныя і іншыя арганізацыі.

Асабліва цяжкімі рэпрэсіямі адказвае фашызм на слова праўды пра СССР.

Тэрор супроць камуністычных паслоў і наогул супроць рэвалюцыйных паслоў, разгром рабоча-сялянскіх дэманстрацый (крывавае 1-га мая), рэпрэсіі ў адносінах да такіх арганізацый як **ППС-лявіца і Сялянская самадапамога**, укіданьне ў турму пралетарскіх вольнадумцаў (працэс 40-ка вольнадумцаў у Новым Сончы, арышт вольнадумскага дзеяча Яна Гэмпля) усё гэта зьвяньні аднаго ланцугу, пры дапамозе якога фашызм хоча задушыць вызваленчае змаганьне працоўных мас.

Львоўскі прыгавор, — гэта адказ на ўзрастаючы рэвалюцыйны рух мас.

Гэты прыгавор зьяўляецца таксама адзнакай пэўнага зруху ў галіне фашысцкай нацыянальнай палітыкі. Крывавая дэманстрацыя ў Пінску, баявая дэманстрацыя віленскага пралетарыяту і гэраічнае змаганьне рабочых Санока і Сокеля—красамоўна сьведчаць аб паглыбленьні антыкупацыйнага руху ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Адначасова становіцца ўсё больш цесным саюз заходня-беларускай і заходня-украінскай буржуазіі з польскім фашызмам, які накіраваны супроць рэвалюцыйнага руху ў Польшчы і на акупаваных землях, а таксама супроць СССР. Усё глыбей прасякае ў беларускія і украінскія працоўныя масы сьвядомасьць, што змагаюцца паміж сабою толькі два лягеры: лягер капіталу, фашызму і сацыял-фашызму ўсякіх нацыянальнасьцяй з рэвалюцыйным антыфашысцкім лягерам на чале з камуністычнай партыяй, **што змагацца супроць акупацыі і нацыянальнага прыгнечаньня можна толькі пад штандарам сацыялістычнай рэвалюцыі ў агульных радох з працоўнымі масамі ўсяе Польшчы.**

Львоўскі прыгавар сьведчыць аб тым, што **фашысцкая дыктатура Пільсудзкага, арганізуючы вайну супроць СССР, пераходзіць да ўсё больш вострых форм тэрору, падрыхтоўваючы глебу для таго, каб у момант выбуху вайны адказаць на кожны рух мас жудаснай оргіяй гвалтаў і крывавых рэпрэсій.**

Узьнімаючы голас пратэсту супроць крывавага прыгавору, працоўныя масы гэтым самым выступаюць на абарону СССР, у абарону вялікай справы сацыялістычнага будаўніцтва.

Львоўскі прыгавар выклікаў глыбокае абурэньне сярод працоўных мас Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Камуністычная партыя Польшчы выкідае вялікую кампанію пратэсту. На фабрыках і капальнях магутна гучыць **патрабаваньне аб скасаваньні прыгавару сьмерці і вызваленьня усіх палітычных вязьняў.**

Працоўныя масы Савецкай Беларусі падтрымліваюць і гэта змаганьне пралетарыяту Польшчы. Толькі салідарная кампанія працоўных мас здолее затрымаць руку катаў, якая хоча накінуць вяроўку на шыю трох маладых, прыгавораных у Львове.

Няхай-жа магутна прагучыць голас пратэсту, няхай хваля абурэньня працоўных мас прымусіць фашысцкіх катаў скасаваць крывавы львоўскі прыгавар.

К.

НЕ ДАПУСЬЦІМ ЗАКІНУЦЬ ВЯРОЎКУ НА ШЫЮ ЗМАГАРОМ

Пашыранае пасяджэньне Менскага акруговага камітэту МОПР'у заслухаўшы інфармацыю аб прысудзе фашысцкага суду ў Львове да кары сьмерцю праз павешаньне трох маладых рэвалюцыянэраў Гірша, Югэнда і Пропера, якія абвінавачаны ў пашырэньні камуністычнай літаратуры і ў прыналежнасьці да камуністычнай партыі, ад імя ўсёй акруговай арганізацыі МОПР'у выказвае сваё глыбокае абурэньне і пратэст супроць фашысцкіх катаў-вешацеляў!

Менскі акруговы камітэт МОПР'у заклікае ўсе арганізацыі Менскай акругі—райкомы і ячэйкі да пратэсту супроць такога нячуванага зладзейскага акту фашысцкай «юстыцыі».

Не дапусьцім закінуць вяроўку на шыю змарагом.

Проч белы фашысцкі тэрор!

Шлем гарачае прывітаньне палітзьняволеным Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

УСЕ НА АБАРОНУ Т. Т. ГІРША, ЮГЭНДА І ПРОПЕРА

Заслухаўшы інфармацыю аб зьверскім прыгавары польскага фашыстаўскага суду над трымя маладымі рэвалюцыянэрамі за прыналежнасьць да кампартыі, **агульны сход членаў МОПР'у ф-кі «Прафінтэрн» і гаркамбінату (Барысаў)** катэгарычна выносіць свой пратэст супроць нячуванага і зьверскага прыгавару суду. На тэрор буржуазіі мы яшчэ мацней згуртуем рады МОПР'у, і адкажам брацкай дапамогай.

Усе, як адзін, на абарону жыцьця прысуджаных т. т. да пакараньня сьмерцю.

НЯ ЎДАСЦА ЗАДУШЫЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ

Агульны сход рабфакаўцаў сумесна з настаўнікамі і студэнтамі падрыхтоўчых курсаў ВНУ, заслухаўшы інфармацыю аб апошніх падзеях ва Львове, кляміць ганьбою зьверскі прагавор польскай буржуазіі над лепшымі змагарамі за справу вызваленьня працоўных.

Мы, пралетарскае студэнцтва, настаўнікі і курсанты ВНУ **катэгарычна пратэстуем** супроць крывавых расправаў польскага фашызму над пралетарыятам і працоўнымі Польшчы і **патрабуем неадкладнай адмены прыгавору сьмерці над т. т. Югэндам, Проперам і Гіршам.**

Ніколі ня ўдасца польскім фашыстым задушыць шаблямі і кулямі рэвалюцыйны рух.

СКАСАВАЦЬ ЗЬВЕРСКІ ПРЫГАВОР

Агульны сход рабочых будаўнікоў унівэрсытэцкага гарадку, выносіць свой пратэст супроць зьверскага прыгавору над трымя львоўскімі камуністымі і **заклікае ўсіх будаўнікоў-сэзоньнікаў гор. Менску ўзьняць свой голас пратэсту з патрабаваньнем скасаваць гэты зьверскі прыгавор.**

У адказ на белы тэрор фашыстых **уступаем усе ў рады МОПР'у і добраахвотна ўносім на карысьць палітзьняволеных 1 проц. месячнага заработку.**

УЗМОЦНІМ РАБОТУ МОПР'У

Агульны сход рабочых швэйнай фабрыкі «Кастрычнік», заслухаўшы інфармацыю **тав. Цудзіна** аб прысудзе да кары сьмерцю, вынесеным фашысцкім судом тром камуністым Гіршу, Югэнду і Проперу за пашырэньне камуністычнай літаратуры, выказвае сваё абурэньне і пратэст супроць нячуванага зьверскага прысуду польскіх катаў-вешацеляй.

Мы, рабочыя-швэйнікі, **патрабуем вызваленьня т. т. Гірша, Югэнда і Пропера. Мы не дапусьцім закінуць вяроўку на шыю нашым братом.**

Сьмерць фашыстым-вешацелям рабочае клясы!

У адказ на белы тэрор фашызму ўзмоцнім работу МОПР'у.

25-годзьдзе паўстаньня на браняносцы „Потемкин"



Сёньня спаўняецца 25 год з дня паўстаньня на брняносцы «Князь Потемкин Таврический».

На здымку: Забойства памоцнікам камандыра браняносца «Патемкин» Пятроўскім матроса Вакулічыка.

З'эканомім дзяржаве сотні тысяч рублёў!

Пры праверцы работы Бабруйскага аддзяленьня Лесбелу рабочыя брыгады выявілі, што адначасова з Лесбелам існуе спэцыяльная арганізацыя «бракераж», у абавязкі якое ўваходзіць тэхнічная ацэнка адгружаемых лесаматар'ялаў і прыёмка апошніх.

На справе ў большасьці выпадкаў арганізацыі самі робяць прыёмку лесаматар'ялаў, бо бракераж сябе не апраўдвае і існуе фактычна толькі на паперы.

Камісія па чыстцы апарату лічыць, што штат бракераў пры нашай сыстэме лесаэксплёатацыі зусім лішні. З гэтай рботай могуць справіцца прарабы і дзесятнікі Лесбелу, бо яны таксама добра знаёмы з тэхнічнымі ўмовамі прыёму.

Па аднэй Бабруйскай акрузе гастралёраў-бракераў, якія фактычна нічога ня робяць і лічаць спэцамі, ёсьць 21 чалавек. У сярэднім кожны з іх атрымлівае 200 руб., што складае звыш 50.000 руб. у год, пя ўлічваючы камандыровачных. Камісія па чыстцы лічыць, што гэты лішні апарат, часта засьмечаны ілжэ-спэцыялістымі, трэба ліквідаваць.

Старшыня камісіі ПІНЧУК.

Ні цэнтральная, ні мясцовыя арганізацыі не пераключыліся на баявую падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю

Мабілізаваць усе сілы на яе правядзеньне

Сялянка, уперад па ўраджай!

Набліжаецца час уборкі новага ўраджаю. Праз два тыдні ўборка збожжа пачнецца ў паўднёвых раёнах. Праз месяц уборачная пара павінна разгарнуцца на ўсіх важнейшых сельска-гаспадарчых раёнах Савецкага Саюзу.

Ураджай зьяўляецца залогам росту і ўмацаваньня сельскае гаспадаркі, далейшага разьвіцьця калгаснага руху, забясьпечвае бесперабойнае забясьпячэньне рабочых і Чырвонай арміі кхлебам, прамысловых прадпрыемствам сыр'ём. Ураджай ёсьць адна з умоў выкананьня пяцігодкі. Ён будзе новым ударам па клясавым ворагу ўнутры краю і за яго межамі.

Своечасовае, арганізаванае, дружнае правядзеньне ўборкі ўраджаю зьяўляецца нашай важнейшай задачай, з якою нельга марудзіць.

Для кожнага павінна быць ясна, што посьпехі уборачнай кампаніі залежыць ад актыўнага ўдзелу ў ёй мільённых батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх жаночых мас.

Жанчына-сялянка па сваёй адсталасьці, немнаце ня рэдка была ў мінулым зброяй у руках клясавага ворага. Цяпер жанчына сялянка—батрачка, бяднячка і сераднячка—пайшла ў рады барацьбітоў за сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі. З кожным месяцам павялічваюцца рады жанчын актывістак, перадавых будаўнікоў сацыялізму ў вёсцы. Актыўны ўдзел жанчын ва ўборачнай кампаніі—лепшае і самае патрэбнае зараз для краю прыкладаньне іх сіл.

27 мая 1930 г. прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР паказаў цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік на неабходнасьць правядзеньня ў бліжэйшым часе шырокіх нарад жаночага савецкага і калгаснага каапэрацыйнага актыву пры райвыканкомах. На гэтых нарадах павінны быць пастаўлены і абмеркаваны пытаньні падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі і высьветлена роля жаночага актыву ў ёй. Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР зьвярнуў увагу на неабходнасьць стварэньня на гэтых нарадах сэкцый для абмеркаваньня важнейшых пытаньняў сельскае гаспадаркі, а ў прыватнасьці сэкцый для разгляду пытаньняў уборачнай кампаніі.

Жанчыны-актывісткі павінны аднесьціся са ўсёй сур'ёзнасьцю да работы гэтых нарад. Яны павінны настойваць па стварэньні сэкцый па ўборцы ўраджаю. Жанчыны-актывісткі павінны ведаць, што ў абавязак сельсаветаў, груп беднаты пры іх, а таксама райвыканкомаў уваходзіць падрыхтоўка для нарад жаночага актыву плянаў работ па правядзеньні ўборачнай і іншых кампаній, што ў гэтых плянах павінны быць выразна і ясна пастаўлены задачы і вызначаны сродкі для іх ажыцьцяўленьня.

Жанчыны-актывісткі пойдуць наперадзе шматмільённай жаночай сялянскай масы ў паходзе па ўраджай. дэлегаткі, члены саветаў работніцы сэкцый, калгасьніцы.

Жанчына-калгасьніца будзе памятаць, што ісьці ўпершых радох па ўборцы ўраджаю яна павінна ня толькі ў сябе, у калгасе. Жанчына-калгасьніца будзе служыць узорам для бяднячкі і сераднячкі-індывідуальніцы. Калгасьніца захопіць яе сваім прыкладам, пакажа ёй усе перавагі калектыўнага аб'яднаньня сельскае гаспадаркі.

Цэнтральныя партыйныя і ўрадавыя органы, каапэрацыйныя і грамадзкія арганізацыі вызначылі рад сур'ёзнейшых мер для забясьпячэньня посьпеху ўцягненьня жанчын ва ўборачную кампанію. Гэтыя меры могуць даць рэзультат толькі ў тым выпадку, калі яны будуць падхоплены на мясцох самымі шырокімі масамі жанчын, калі пачын які ідзе з цэнтру, спаткаецца з пачынам, ідучым з месц ад самых шырокіх мас жанчын.

Пачатак уборачнай кампаніі супадае з работай XVI зьезду УсеКП(б) — вярхоўнага органу ленінскай партыі, вядучай рабочую клясу і сялянства да сацыялізму. Пасьпяховая падрыхтоўка і вядзеньне ўборачнай кампаніі будзе лепшым падарункам зьезду, палегчыць яго складаную работу і забясьпечыць посьпех ажыцьцяўленьня яго пастаноў.

Будуйце ўдарныя ўборачныя брыгады імя XVI зьезду

Згуртоўвайце рады вакол партыі Леніна!

Сялянка, наперад па ўраджай!

Да посьпехаў на ўсіх вучастках сацыялістычнай будоўлі дабавім новы: 100 проц. выкананьне ўборачных і хлебазагатоўчых плянаў.

Старшыня Камітэту пры прэзыдыуме ЦВК Саюзу ССР па палепшэньні працы і быту работніц і сялянак

А. ЕНУКІДЗЕ.

Стаўка на самацёк

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі на Магілеўшчыне праходзіць надзвычай марудна і зусім нездавальняюча. «Камунар Магілеўшчыны» два тыдні таму назад абвясьціў трохдзеньнік праверкі падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю. Але лічэ на сёньняшні дзень да праверкі фактычна ня прыступлена. Тэмпы падрыхтоўкі застаюцца далёка небалявымі.

Акрэкалгасаюз, акрпаляводсаюз і іншыя каапэрацыйныя арганізацыі спадзяюцца на самацёк, на тое, што месцы самі зробяць усё, што трэба. Округа пакуль што абмяжоўваецца толькі цыркулярамі і абяцаньнямі. Цікава адзначыць, што да гэтага часу ні акрэкалгасаюз, ні паляводсаюз ня склалі плянаў уборачнай кампаніі Ня мае іх і большасьць калгасаў.

Завоз уборачных машын ідзе вельмі дрэнна. Зусім няма кос, сярпоў і іншдробнага ўборачнага інвэнтару. Даная Белпаляводсаюзу заяўка на 35 шт. кос і 8.000 сярпоў яшчэ ня выканана.

Вельмі востра стаіць пытаньне з кадрамі для зборкі складаных машын. Па ўсёй акрузе ёсьць усяго два чалавекі, якія ведаюць гэту справу.

Ня прыступлена да будаўніцтва складачных памяшканьняў у калгасах. Ніякай падрыхтоўкі да ажыцьцяўленьня гэтай справы не праводзіцца. Між тым, у радзе калгасаў зусім няма складаў, а калі яны і ёсьць, дык ня прыгодныя для хаваньня ўраджаю.

З рамонтам уборачных машын і інвэнтару справа стаіць вельмі дрэнна. Саматужная каапэрацыя мае 19 майстэрань, але яны да работы не прыступілі бо няма жалезаа Ні акрэкалгасаюз, ні паляводсаюз ня ведаюць, колькі наогул машын патрабуе рамонту.

Пагражаючым вучасткам зьяўляецца і справа пажарнай аховы ў саўгасах. У большасьці калгасаў няма ніякага пажарнага інвэнтару.

Трэба ўжыць належныя меры, каб дабіцца зруху ў падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю ў Магілеўшчыне.

А. С.

СЬВІНАВОДЧЫЯ КАЛГАСЫ НЕ РАЗГАРНУЛІ БУДАЎНІЦТВА

Укамплектаваньне матачным матар'ялам ідзе марудна

Больш ініцыятывы і самадзейнасьці. Па-ўдарнаму разгарнуць мерапрыемствы па разьвіцьці жывёлагадоўлі

23.000 матак замест 100.000

На калгасны сэктар БССР ускладаецца сёлета надзвычай адказнае заданьне —у 435 калгасах паставіць 100.000 сьвінаматак.

Як ідзе выкананьне гэтага заданьня?

Дакладны вестак, як працякае ход будаўніцтва ў калгасных сьвінаводчых гаспадарках, прывесьці немагчыма, бо гэтых вестак ніадзе няма. Адрывачныя весткі ёсьць толькі з Гомельскай акругі, дзе прыступлена да пабудовы сьвінухоў у 37 калгасах (усяго ў акрузе выдзелена пад сьвінаводчыя гаспадаркі 77 калгасаў).

Можна з упэўненасьцю сказаць, што будаўніцтва, як належыць, яшчэ не разгарнулася ва ўсіх округах.

Адна з прычын такога зьявішча — адсутнасьць заінтэрэсаванасьці ў гэтай справе акруговых і раённых арганізацый, а часта і саміх калгасаў. Месцы заяўляюць, што будаўніцтва затрымліваецца з-за адсутнасьці дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў, галоўным чынам цьвікоў. Праўда, сьвінаводныя гаспадаркі не забясьпечаны поўнасьцю будаўнічымі матар'ялам для пабудовы сьвінухоў. Але справ ня толькі ў гэтым. Можна, не чакаючы атрыманьня дэфіцытных матар'ялаў з цэнтру, адшукаць у сябе — у раёне або ў калгасе — некаторую колькасьць будаўнічых матар'ялаў, каб пачаць будаўніцтва. Для гэтага патрэбна шчырае жаданьне і энэргічная, дружная работа.

Наступны факт яскрава гэта пацьвярджае Прыяжджаўшаму ў Клімавіцкі раён работніку Малжысаюзу было заяўлена, што з прычыны адсутнасьці цьвікоў нельга пачаць будаваць сьвінухі. З дапамогай гэтага работніка пачалі шукаць цьвікоў і некаторую колькасьць адшукалі. Цьвікі раздалі па калгасах (па 3-4 скрыні кожнаму) і будаўніцтва пачалося.

Некаторыя калгасы, вылучаныя пад сьвінаводчыя гаспадаркі, замест таго, каб у першую чаргу прыступіць да пабудовы сьвінухоў, займаюцца па-за плянавым будаўніцтвам, выкарыстоўваючы на гэта ўвесь запас наяўных будаўнічых матар'ялаў. У адказ на запытаньне, чаму так робіцца? — гавораць — «нам зараз не да сьвінухоў, у нас і так работы шмат». Шкоднасьць такіх разважаньняў відавочная.

З сьвінаадкормачных пунктаў паведамляюць у калгасныя сьвінаводчыя гаспадаркі ўсяго 2.000 матак (пры заданьні ў 22.000). Многія адкормачныя пункты (райкалгассаюзаў, раймалжысаюзаў) ужо пасьпелых сьвіней чамусьці яшчэ трымаюць на пунктах і не накіроўваюць у калгасы. А на некаторых адкормачных пунктах Белкаапсаюзу ў Мазыршчыне і наогул ня ведалі, што ім зрабіць са сваімі сьвіньнямі. Паводле дырэктывы, гэтыя пункты павінны здаць сьвінаматак сьвінаводчым саўгасам, але такіх гаспадарак у гэтых раёнах няма. У сувязі з гэтым тут парашылі сьвіней... зарэзаць.

Укамплектаваньне базуецца яшчэ на кантрактацыі і загатоўцы матачнага матар'ялу. Закантрактавана-ж сьвіней на 10 чэрвеня 2.274 пры пляне кантрактацыі ў 62.000 сьвіней, кныроў—341 пры заданьні ў 3.500. Аб загатоўцы сьвіней у калгасных сьвінаводных гаспадарках складае 6.000 матак. Да гэтага трэба дадаць прыблізны прыплод у 12.000 падсьвінкаў. 5.000 сьвіней з адкормачных пунктаў, каля 2.000 сьвіней ад кантрактацыі. Такім чынам, усяго ёсьць толькі 23.000 сьвінаматак. Гэта лічба вельмі і вельмі далёка ад заданьня ў 100.000 сьвінаматак.

Трэба мабілізаваць увагу калгасных мас вакол пытаньняў сьвінагадоўлі, трэба, каб мясцовыя арганізацыі выяўлялі больш самадзейнасьці і ініцыятывы, ударна разгарнуўшы работу па будаўніцтве сьвінаводчых гаспадарак.

Л. Н.

НЕДАПУШЧАЛЬНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ

Кантрактацыя жывёлы і маладняка на Мазырскай акрузе фактычна сарвана. Усе тэрміны ўжо мінулі. Плян гадоўлі цялят ледзьвара не даведзен. Мер да палепшэньня работы з боку акрмалжывсаюзу ніякіх ня прымаецца.

Абсьледаваньне Жытковіцкага, Тураўскага і Пятрыкаўскага раёнаў выявіла наступны малюнак. Калгасы кантрактацыяй ахвячаюць да ліку наяўных кароў, авец і цялят. У сярэднім ня звыш 5-7 проц., а ў валове калгасаў зусім нічога ня зроблена ў гэтай галіне. У індывідуальным сэктары выпадкі кантрактацыі налічваюцца адзінкамі. Цяляты зьнішчаюцца. Няма ніякага кіраўніцтва раёнам з боку акрмалжывсаюзу. Райсаюзы працуюць самацёкам. Інструктар па кантрактацыі сядзіць у акрузе, хаця і быў вылучан на гэту работу яшчэ 10 мая. Дагэтуль ён не зрабіў яшчэ ні аднаго выезду на раёны. Праўленьне не практыкуе інструктажу ніазвых работнікаў. У непматаніх заключаных дагаворох многа няправільнасьцяй. Праўленьне акрмалжысаюзу ня цікавіцца кантрактацыяй. У значнай меры — гэта вынік «апускных настрояў». Гэткія адносіны праўленьня да такога важнага і сур'ёзнага пытаньня, як кантрактацыя жывёлы і маладняка, зразумела, ня спрыяюць вырашэньню жывёлагадоўчай праблемы, якой партыя зараз аддае вялікую ўвагу.

Патрэбны адпаведныя меры.

Р.

Адзінай маналітнай падышла КП(б)Б да XVI зьезду УсеКП(б)

Згуртаваныя вакол генэральнай лініі партыі партарганізацыі даюць руйнуючы адпор праваапартуністычным вылазкам і прымірэнцкім адносінам да ўхілаў ад ленінскай лініі партыі

Прапрацоўкай тэзісаў ад XVI зьезду УсеКП(б) і пастаноў XIII зьезду КП(б)Б партыйныя масы яшчэ больш павысілі сваю бальшавіцкую баяздольнасьць і непрымірымасьць да правага і „левага" апартунізму

Шчыльней згуртуем рады

(З рэзалюцыі сходу партактыву г. Магілева па дакладу сакратара ЦК КП(б)Б т. Гея аб выніках XIII зьезду КП(б)Б)

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б т. Гея аб выніках работ і аб пастановах XIII зьезду КП(б)Б, сход партактыву г. Магілева цалкам і поўнасьцю ўхваляе і далучаецца да пастаноў XIII зьезду, якія поўнасьцю адпавядаюць генэральнай лініі партыі.

XIII зьезд КП(б)Б прайшоў пад знакам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, яшчэ большага ўзмацненьня адзінства і баяздольнасьці КП(б)Б у барацьбе за генэральную лінію партыі супроць правых і «левых» апартуністых, нацыянал-апартуністых і трацкісцкіх рэцыдываў.

Партактыў канстатуе, што за пэрыяд ад XII да XIII зьезду, уся КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК, цьвёрда змагаючыся за чыстату рэвалюцыйнай, марксыцка-ленінскай тэорыі, вядучы змаганьне на два фронты, перамагаючы ўсялякага роду ўхілы ад генэральнай лініі партыі,—ушчэнт разьбіла рэшткі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, панесла руйнуючы ўдар праваму ўхілу, які застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, і дала рашучы адпор «левым» загібам і прымірэнцтву да іх, што стваралі і ствараюць пагрозу паслабленьня вытворчай змычкі рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства.

КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, вядучы жорсткае змаганьне з правымі нацыянал-дэмакратызму, шавінізму ўсіх колераў, здолела правільна і пасьпяхова ажыцьцяўляць нацыянальную палітыку ў складаных умовах цяперашняга пэрыяду.

Актыў вітае выразнасьць установак XIII зьезду па пытаньнях змаганьня з правымі і «левымі» апартуністымі і прымірэнцамі, якімі зьезд у яшчэ большай меры ўзьняў баяздольнасьць партарганізацый і ўзброіў іх на далейшае рашучае змаганьне на два фронты.

Актыў падкрэсьлівае правільнасьць установкі XIII зьезду КП(б)Б аб тым, што галоўнай і асноўнай небясьпекай на даным этапе застаецца права-апартуністычны ўхіл.

У выніку пасьпяховага змаганьня з правымі ўхілаў ад ленінскай лініі, уся КП(б)Б, як і ўся УсеКП(б) пад кіраўніцтвам бальшавіцкага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, пільна ахоўваючы жалезнае адзінства партыі, якое было і застаецца ненахісным, вышла да XIII зьезду яшчэ больш згуртаваная вакол ленінскага ЦК, і няўхільна ідзе па ленінскім шляху да канчатковай перамогі ў пабудове сацыялізму, да пасьпяховага ажыцьцяўленьня лёзунгу: «Пяцігодка за чатыры гады».

На аснове генэральнай лініі і правільнага кіраўніцтва ЦК, партыя за пэрыяд ад XII да XIII зьезду дабілася вялізарных посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве, якое характарызуецца разгорнутым наступленьнем на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, пераходам ад палітыкі абмежаваньня кулака да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, што выклікала яшчэ больш жорсткае абвастрэньне клясавага змаганьня. Гэты пэрыяд зьяўляецца пачаткам пасьпяховага выкананьня пяцігадовага пляну, які пераўтварае Савецкую Беларусь з краю гаспадарча адсталага ў край са шырка разгорнутым прамысловым будаўніцтвам.

Партыя, пад кіраўніцтвам ЦК, рашуча выпраўляла і выпраўляе памылкі і скрыўленьні, дапушчаныя ў практычным правядзеньні ў жыцьцё генэральнай лініі партыі ў галіне калектывізацыі, якія мелі месца ў радзе паасобных партарганізацый КП(б)Б, ня гледзячы на своечасовыя і выразныя дырэктывы ЦК УсеКП(б).

Партактыў заклікае ўсю партарганізацыю цьвёрда і няўхільна праводзіць у жыцьцё пастановы XIII зьезду КП(б)Б, рашуча змагаючыся за далейшае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі супроць правых апартуністых і «левых» загібшчыкаў і прымірэнцаў да іх, супроць праяў нацыянал-дэмакратызму і шавінізму ўсіх колераў, за пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за далейшае разгортваньне калектывізацыі сельскай гаспадаркі, за ўзмацненьне палітычнага выхаваньня рабочай клясы, за далейшую мабілізацыю актыўнасьці яе і батрацка-бядняцка-серадняцкай масы на выкананьне чарговых задач партыі, на грунце шырокай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Партактыў лічыць необходным шырока распрацаваць і папулярызаваць пастановы XIII зьезду КП(б)Б для цьвёрдага і няўхільнага правядзеньня іх у жыцьцё, зрабіўшы іх шырокай уласнасьцю рабочых мас і батрацка-бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

Партактыў аднадушна далучаецца да пастаноў партзьезду і партканфэрэнцый і пастаноў рабочых арганізацый аб узнагародзе т. Сталіна ордэнам Леніна.

Няхай жыве КП(б) і яе Ленінскі Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве XVI зьезд УсеКП(б)!

Прапрацоўка тэзісаў т. Якаўлева выклікала новы прыліў у калгасы

Парт'ячэйка **калгасу «Бальшавік Беларусі»** (Клімавіцкі раён, Магілеўшчына) закончыла прапрацоўку тэзісаў тав. Якаўлева да XVI зьезду УсеКП(б). У прапрацоўцы пастаноў побач з усімі партыйцамі прымалі ўдзел камсамольцы і беспартыйныя актывістыя калгасьнікі.

Парт'ячэйка цалкам і поўнасьцю ўхваліла тэзісы тав. Якаўлева і ўжыла рад мер па папулярызацыі тэзісаў сярод шырокіх мас калгасьнікаў, батрацтва і беднаты сельсавету.

Ячэйка намячае прапрацаваць тэзісы сярод беднаты, калгасьнікаў і сераднякоў 10-ці вёсак Раднянскага сельсавету. У 5-ці вёсках ужо адбыліся сходы калгасьнікаў разам з беднякамі і сераднякамі індывідуальнікамі з пастаноўкай дакладаў аб тэзісах тав. Якаўлева. На гэтых сходах у абгаварэньні тэзісаў калгасьнікі, беднота і сераднякі прымалі актыўны ўдзел. Яны ў сваіх выступленьнях аднадушна канстатавалі правільнасьць палітыкі партыі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. **На гэтых сходах усюды аднагалосна ўхвалены тэзісы т. Якаўлева. Прапрацоўка тэзісаў т. Якаўлева выклікала новы прыліў бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы.** Пачалі паступаць новыя заявы ад беднякоў і сераднякоў індывідуальнікаў аб прыёме іх у калгас. Гэтымі днямі прынята ўжо ў члены калгасу «Бальшавік Беларусі» **8 чалавек: 5 беднякоў і 3 сераднякі.** З тых вёсак, у якіх адбылася прапрацоўка, паданы яшчэ 5 новых заяў аб прыёме ў члены калгасу.

Н. РАГОЗІН.

Правыя апартуністыя ўзмацняюць атакі супроць генэральнай лініі партыі

Яшчэ больш узьняць баяздольнасьць партыйных мас для барацьбы з правай небясьпекай,

Рэчыцкая партарганізацыя (Гомельшчына) шырока разгарнула работу па прапрацоўцы тэзісаў да XVI зьезду УсеКП(б). У часе прапрацоўкі тэзісаў выявілася ў арганізацыі паяўнасьць правых апартуністых, выяўлена рад прымірэнцаў да правых ухілістых.

На аб'яднаным сходзе **парт'ячэек ЦРК і хлебазаводу** пры прапрацоўцы тэзісаў тав. Куйбышава член бюро ячэйкі хлебазаводу **т. Брылом** выступіў з прапагандай праваапартуністычных поглядаў, з нападкамі на генэральную лінію партыі, з мэтай дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва. Гэты яўны правы апартуністы адкрыта выступіў супроць узятых партыяй тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Ён літаральна заявіў наступнае: «Тэмпы будаўніцтва зьяўляюцца непасільнымі. Лёзунг партыі «Пяцігодку за чатыры гады» зьяўляецца няправільным, бо пяцігодку мы можам выканаць толькі за 7-8 год». Гэтыя капітулянцкія погляды, уласьцівыя ўсім апартуністым, Брылом прапагандаваў на сходзе ячэйкі, актыўна іх абараняў. Гаворачы аб выкананьні прамфінплану, Брылом прапануе ісьці павальней па лініі выкананьня прамфінплану і падае такі прыклад з хлебазаводу, дырэктарам якога ён працуе: «Вазьмеце наш хлебазавод. Мы выканалі прамфінплян на 124 проц., а хлеб выходзіць сыры, а калі мы выконвалі прамфінплян на 60-70 проц., тады прадукцыя была лепшай».

Далей апартуністы Брылом прапануе «не разьвіваць толькі цяжкай індустрыі, а ўзяць сродкі з цяжкай індустрыі і за лік яе разьвіваць лёгкую». Брылом перапявае старыя песенькі правых апартуністых, тэорыі якіх дашчэнту разьбіты тымі грандыёзнымі посьпехамі, якія набыты на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, дзякуючы правільнасьці генэральнай лініі партыі.

Выступаўшы потым таварыш далі належны адпор выступленьню гэтага капітулянта, кваліфікавалі яго, як адкрытую вылазку правага апартуністага, як атаку генэральнай лініі партыі. Зараз жа пасьля гэтых выступленьняў пакалі свой твар і прымірэнцы да правага апартунізму, якія на працяту ўсяго часу ня выказвалі сваёй думкі па прынцыповых пытаньнях партыйнага жыцьця. Партыйцы **Казлоўскі, Кярнацкі, Равіковіч** выступілі ў абарону правага апартуністага і яго выступленьня з нападкамі супроць тых таварышоў, якія далі адпор выступленьню правага апартуністага Брылома.

Сход рашуча асудзіў і даў жорсткі адпор вылазцы правага апартуністага і прымірэнцаў. Трэба яшчэ больш мабілізаваць партыйныя масы на бязьлітасную барацьбу з правай небясьпекай, самай галоўнай на даным этапе. У адносінах да правых апартуністых трэба ўжыць меры, выказаныя пастановай партыі аб тым, што прапаганда праваапартуністычных поглядаў несумяшчальна з прабываньнем у радох бальшавіцкай партыі.

Д.

Партыйныя масы далучаюцца да тэзісаў XIV зьезду

Па ўсіх парт'ячэйках КП(б)Б Дрысенскай партарганізацыі (Полаччына) сконда XVI зьезду УсеКП(б) аб калгасным руху і ўздыме сельскае гаспадаркі.

Пры прапрацоўцы тэзісаў выявілася, што рад членаў партыі тэарэтычна слаба падрыхтаваны, а ў некаторых выпадках

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

АПАРАТ-ПАД АГОНЬ КРЫТЫКІ МАС

Наркампрацы--перад судом рабочай грамадзкасьці

Шырокае разгортваньне сацыялістычнай перабудовы ўсіх галін народнае гаспадаркі і грамадзкага жыцьця нашага краю высоўвае перад органамі працы новыя на сваім зьмесьце практычныя задачы. Галоўнейшымі з іх зьяўляюцца ў цяперашні час — плянавае забесьпячэньне прамысловасьці кваліфікаванай рабочай сілай і навуковая арганізацыя працы ў вытворчасьці.

На жаль, першыя зробленыя ў гэтым важным пытаньні крокі паказалі, што апарат Наркампрацы БССР і яго органы аказаліся не на вышыні пры ажыцьцяўленьні гэтых задач.

„Без руля и ветрил"...

Кіраўніцтва з боку НКПБ мясцовымі яго органамі слабое. Акруговыя аддзелы працы атрымліваюць выключна сухія цыркуляры, якія ў большасьці выпадкаў уносяць толькі блытаніну ў практычнай рабоце. Дзякуючы гэтаму, на мясцох работа за апошні час значна паслабла (Менск, Полацак).

Работа апарату НКПБ да гэтага часу пастаўлена надзвычай дрэнна. Калі ў 1928-29 г. штат НКПБ (уключаючы і Галоўсацстрах) складаў 43 чалавекі, дык зараз налічваецца 55, а на будучы год мяркуецца павялічыць штат да 62 чал. Створаны пасады старэйшых, малодшых і сярэдніх інспэктароў сэзоннага рынку працы, але хто з іх старшы і малодшы — яны самі ня ведаюць. Адзін і той-жа работнік называе сябе то старшым інспэктарам, то загадчыкам сэктарам або кіраўніком групы. Ня дзівіцца, якое можна было перадаць русна, пасылаюць праз пошту адкрытка, якая атрымліваецца ў інспэкцыі праз пару дзён.

Старшы тэхнічны інспэктар т. Сахоўскі, седзячы за адным сталом з юрыскансультам, піша апошняму рэзалюцыю на паперы, апошняе перадаецца ў канцылярыю і адтуль перадаецца юрысконсульту праз 7 дзён у той час, калі ён мог атрымаць думку юрысконсульта на працягу некалькіх мінут.

Работнік Еўламп'еў, выконваючы тэлеграфнае даручэньне Масквы, здае работу ў машыннае бюро, а на самой тэлеграме робіць надпіс: «перадаў у машыннае бюро — адказнасьць на канцылярыю». Калі насьцепгазэта адзначыла бюракратычныя і безадказныя адносіны з боку Еўламп'ева, апошні ўзяў у архіве тэлеграму і вычысьціў гумкай усю рэзалюцыю.

Як у наркамаце адносяцца да самакрытыкі

Крытыка і самакрытыка ў апараце Наркампрацы разгорнута вельмі слаба. Рад работнікаў гаворыць аб недахопах на закутках. Вінавата часткова ў гэтым адміністрацыя, якая бюракратычна «рэагуе» на ўсе выяўленыя насьцепкорамі недахопы ў рабоце апарату.

У насьцепгазэце пісалася аб неабходнасьці ўмацаваньня працоўнай дысцыпліны, аб адсутнасьці кантролю прыходу супрацоўнікаў на работу. Кантрольная кніга фактычна зьяўляецца бескантрольнай. Часта кніга забіраецца замест 9 гадзіны значна пазьней. Некаторыя супрацоўнікі расьпісваюцца ў кантрольнай кнізе за некалькі дзён адразу.

Пошта, якая атрымліваецца, панадае да функцыянэраў на другі-трэці дзень. Рэдкалегія на гэта паказала, што трэба скараціць колькасьць інстанцый прахаджэньня паперак, але адміністрацыя ўсё роўна робіць пасвойму. Уваходзячыя паперы праходзяць праз 4 рукі пакуль пападаюць да функцыянэра.

Выпісваецца непатрэбная літаратура, у тым ліку і замежная. Траціцца на яе шмат грошай, але ніхто ёю не карыстаецца. Ня гледзячы на тое, што насьцепгазэта паказала на такое ненармальнае зьявішча, адміністрацыя не зварачае на гэта ўвагі і паранейшаму выпісвае непатрэбную літаратуру, выкідваючы на вецер шмат дзяржаўных грошай. Сыгналы рэдкалегіі аб бюракратызьме апарату адміністрацыя абыходзіць моўчкі.

Наркампрацы, які парушае законы працы

Ня гледзячы на тое, што па сваёй прыродзе органы НКП павінны быць непарыўна зьвязаны з грамадзкасьцю і шанаваць яе думку, мы ўсё-ж назіраем, што адміністрацыя НКПБ яўна ігнаруе нават грамадзкасьць сваёй установы. Усім, напрыклад, вядомы закон аб абавязку прадпрыемстваў і устаноў паведамляць фабзаўмясцкомы аб наборы служачых і новых пасадах, якія адкрываюцца. Гэты закон, аднак, не датычыць НКПБ, які направа і налева набірае каго хоча і не знаходзіць патрэбным паведаміць групком. Так прыняты быў цэлы рад работнікаў, супроць некаторых бязумоўна быў-бы адвод з боку грамадзкіх арганізацый.

Зусім бесцэрэмонна адміністрацыя дзейнічае таксама і ў пытаньні аб стаўках. Калі за апошні час рад устаноў прыцягваўся Наркампрацы да адказнасьці за парушэньне ўстаноўленых ставак, дык НКПБ самому сабе гэта дазволіла. Асабліва недапушчальна тое зьявішча, што НКПБ, не сарамяючыся, дапускае нават рад парушэньняў у сэтке аховы працы, выкананьня калдагавору і г. д.

Усё вышэйпамянёнае зьяўляецца толькі часткай ненармальнасьцяй у рабоце Наркампрацы.

Мы лічым, што надыходзячая чыстка апарату НКПБ і яго органаў павінна моцна ўдарыць па ўсіх гэтых ненармальнасьцях.

К. і С.

ПАРТЫЯ ПАТРАБУЕ:

Баявой, выразнай работы па забесьпячэньні рабочых цэнтраў.

Правільнай арганізацыі клясавага разьмеркаваньня рэчаў спажываньня.

Абнаўленьня каапэрацыйнага апарату клясава вытрыманымі пралетарскімі кадрамі.

Паляпшэньнем якасьці прадукцыі павялічым рэальную зарплату рабочага

У тэзісах тав. Куйбышава да дакладу на XVI зьезьдзе УсеКП(б) гаворыцца:

«Асабліва нецярпімым зьяўляецца становішча з якасьцю прамысловай прадукцыі, якая знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні і ў паасобных выпадках мае тэндэнцыю да далейшага пагоршаньня... У адносінах якасьці прадукцыі павінна быць устаноўлена ня меншая адказнасьць гаспадарчых органаў, чым за невыкананьне колькасных заданьняў перад гаспадарчымі органамі, прафорганамі, прафарганізацыямі, камсамолам, друкам і ўсёй рабочай грамадзкасьцю павінна быць пастаўлена задача ўцягненьня шырокіх мас працоўных у работу па рашучым паляпшэньні якасьці прадукцыі і шырокага выкарыстаньня для гэтага такіх форм арганізацыі працы, як сацспаборніцтва і ўдарніцтва».

Па пытаньні аб паляпшэньні якасьці прадукцыі ёсьць рад катэгарычных дырэктыў партыі і ўраду.

Аб тым, як многія гаспадарчыя і каапэрацыйныя органы Беларусі выконваюць гэтыя дырэктывы партыі, паказвае той факт, што скаргаў на нізкую якасьць прадукцыі не зьмяншаецца, а ўзрастае. У Белкаапсаюзе, ЦРК назьбіраліся цэлыя тамы актаў. На адным толькі складзе гатовае вопраткі МЦРК напісана 27 актаў аб нядобраякаснай прадукцыі. Але акрамя актаў у ЦРК паступаюць штодзённа жывыя «экспанаты» прадукцыі непасрэдна ад пайшчыкаў. Сярод гэтых «экспанатаў»—абутак, гатовая вопратка і г. д.

Работнікі дзяржаўных прадпрыемстваў, арцеляй недаацэньваюць значэньня выкананьня паказчыкаў якасьці прадукцыі, ня цікавяцца гэтым пытаньнем, ад якога ў значнай часьці залежыць павышэньне рэальнай зарплаты.

Расказваюць аб такім выпадку: у адным з каапэрацыйных магазынаў нейкі грамадзянін мераў абутак; надзеў лёгка, а зьняць ніяк ня можа. Вялікі цьвік так усхаў у нагу, што прышлося разрэзаць абутак.

Падамо яшчэ рад найбольш характэрных фактаў з работы некаторых саматужных арцеляй і дзяржаўных прадпрыемстваў.

Бабруйскі ЦРК атрымаў ад Гомельскай фабрыкі Белскурэтрэсту «Праца» 200 пар ботаў. Але ўсе боты аказаліся няпарнымі. Апрача таго, заднікі былі так высока ўстаўлены, што рэзалі нагу, разьмер ботаў не адпавядаў пад'ёмам. Уся партыя ботаў была забракавана і не дапушчана да рэалізацыі.

Слуцкая абутковая саматужная арцель «Іскра» выпусьціла партыю гамашаў, у якіх наскі былі пукатыя, адзін насок даўжэйшы за другі, заднікі няправільна прыстаўлены. 15 проц. абутку было забракавана.

Возьмем гатовую вопратку. У 38 аімовых жаночых політак, здадзеных Менскай швэйнай фабрыкай «Кастрычнік» ЦРК, былі звужаны сьпінкі на 2 сантымэтры.

На прапанову абмяняць ці перарабіць нягодны тавар, работнікі складу Швэйтрэсту адказваюць:

— Пашлем тавар туды, дзе менш бракуюць.

Лагойская арцель «Новае Жыцьцё» здала 500 пар парток. Паясы ў гэтых портках былі зроблены—адна палавіна з фланэлі, другая з паркалю, прычым гэты паркаль быў зшыты з кавалкаў з 6-ці колераў. Большасьць портак была без зацяжак, кішэні зроблены вельмі кепска. Тавар забракавалі. Арцель панцярпела страту на суму каля 1.000 руб.

Характэрна, што пасьля адмаўленьня ў прыёме нягоднай прадукцыі, паступленьне тавараў, наогул, на склады каапэрацыі зьмяншаецца. Прадпрыемствы і арцелі лічаць больш мэтазгодным адсылаць прадукцыю ў тыя раёны, дзе бракераж адсутнічае. Устаноўленыя Наркамгандлем штрафы за нягодную прадукцыю нічога не даюць.

Гэтыя факты гавораць самі за сябе.

У чым асноўная прычына пагаршэньня якасьці прадукцыі? У нядбайных адносінах да работы, у адсутнасьці кантролю над прадукцыяй, якая выпускаецца, і сьвядомасьці таго, што барацьба за якасьць прадукцыі зьяўляецца барацьбою за павышэньне рэальнага ўзроўню зарплаты.

Члены швэйных саматужных арцеляй Беларусі, напрыклад, да гэтага часу кансэрватыўна адносяцца да ўсякіх рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў у адносінах раскрою і сыстэмы работы. На якасьць прадукцыі ў арцелях мае ўплыў яшчэ і адсутнасьць абсталяваньня, адпаведных памяшканьняў, культае вытворчы інструктаж. Белсампрамсаюз замест таго, каб паслаць інструктара-спэцыялістага на прадпрыемствы, і наладзіць работу, звычайна абмяжоўваецца цырлулярамі.

Прафарганізацыі часта стаяць у баку ад барацьбы за якасьць прадукцыі.

Грамадзкасьць павінна рашуча ўдарыць на нядбайных адносінах да якасьці тавараў з боку некаторых дзяржаўных і каапэрацыйных прамысловых прадпрыемстваў.

Прамысловасьць і каапэрацыя не павінны забываць, што дрэнная якасьць прадукцыі—удар па зарплаце рабочага.

М. КІН.

Падрыхтоўку кадраў для спажывецкай каапэрацыі— у цэнтр увагі партарганізацый

Усім адома, якое значэньне набывае зараз спажывецкая каапэрацыя ў сыстэме народнай гаспадаркі. Між тым, спажывецкая каапэрацыя зусім не забясьпечана адпаведнымі пралетарскімі кадрамі. Частка старых работнікаў спажывецкай каапэрацыі зусім нездольна на праводзіць у жыцьцё новыя формы і мэтады сацыялістычнага разьмеркаваньня. Апарат спажывецкай каапэрацыі засьмечан нэпманскім элементам. Усё гэта вымагае максімальна паскорыць тэмпы падрыхтоўкі новых пралетарскіх кадраў.

Між тым, аддзел кадраў, які існуе пры Белкаапсаюзе, гэтай важнейшай справе надае вельмі мала ўвагі. Белкаапсаюз мавае ня ведае, колькі людзей працуе ў спажывецкай каапэрацыі і хто гэтыя людзі. Выдучэньне новых работнікаў з рабочых і работніц ад варштатаў, батракоў, беднякоў, калгаснікаў, якія маглі-б цьвёрда і правільна правесьці клясавую лінію ў практычнай рабоце робіцца самацёкам бла ўсякай плянавасьці. І ці можа быць плянавасьць у гэтай справе, калі аддзел кадраў Белкаапсаюзу ня ведае, колькі патрэбна новых людзей і каго трэба замяніць.

Нядаўна для ўсеБеларускае выстаўкі патрабаваліся лік і сацыяльны склад работнікаў спажывецкай сыстэмы БССР. Аддзел кадраў Белкаапсаюзу, калі да яго зьвярнуліся, запрапанаваў запытацца па гэтым пытаньні ў Цэнтраархіве.

Будзем спадзявацца, што да канца пяцігодкі загадчык аддзелам кадраў т. Вайзбар, бязумоўна, арганізуе ўлік асабістага складу спажывецкае сыстэмы БССР. Зараз ён ужо аддаў распараджэньне пісоўцы, каб яму даслалі весткі.

РСІ павінна зацікавіцца гэтым важным палітычным пытаньнем і выявіць сапраўдныя прычыны бязьдзейнасьці Белкаапсаюзу ў справе падрыхтоўкі кадраў для спажывецкай каапэрацыі.

ЗНАЁМЫ.

Засьмечанасьць складу малочнай каапэрацыі Бабруйшчыны

Фонды каапэраваньня беднаты нескарыстаны

Зараз праводзіцца абсьледваньне работы малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі Бабруйскае акругі.

Першыя папярэднія вынікі абсьледваньня паказваюць надзвычай дрэнны малюнак. Ня гледзячы на тое, што Бабруйскі акруговы малочна-жывёлагадоўчы саюз існуе ўжо 16 месяцаў, апарат гэтай установы дагэтуль не зразумеў важнасьці сваёй работы і пастаўленых перад ім задач. Цікава адзначыць, што ў акрамалжывсаюзе вельмі мала зварачалі ўвагі на падбор супрацоўнікаў і ўкамплектаваньне штату спэцыялістымі. На працягу доўгага часу ў апараце ня было інструктароў-арганізатараў і зоатэхнікаў. Адзін інструктар-малакавед, які быў у апараце, пераведзен на работу ў склад, зоатэхніка-ж звольнілі.

Мала зварачалася ўвагі і на вылучэньне ў апарат рабочых. Вылучэнцы, якія ўжо працуюць там, не атрымліваюць належнай дапамогі з боку адказных работнікаў і спэцыялістых. Сыстэматычнай работы з вылучэнцамі ня было. Яны былі прадстаўлены самі сабе. Вылучэнку Пліхту з апарату акрамалжывсаюзу перакінулі ў Бабруйскі райпаляводсаюз, дзе яна і да гэтага часу ня ведае, што рабіць.

Сетка малочных жывёлагадоўчых таварыстваў не адноўлена. Таксама ня прыступлена да арганізацыі новых вытворчых аб'яднаньняў. Гэта гаворыць аб тым, што індывідуальны сэктар зусім выпаў з-пад увагі малочнага саюзу. Акрамалжывсаюз вельмі мала пікавіўся сацыяльным складам каапэраваных членаў. У выніку сярод пайшчыкаў ёсьць кулакі і былыя жандары. Беднякі складаюць усяго 18 проц. пайшчыкаў у той час, калі значныя сумы фондаў каапэраваньня беднаты не скарыстаны. Карэспандэнт на адпускаліся, як бедняком, так і сярэдняком па адпускальных нормах. За карыстаньне злучнымі пунктамі беднякі плацяць столькі-ж, колькі сярэднякі.

Яшчэ ў 1928-29 годзе ў акрузе было пачата будаўніцтва двух масларобчых заводаў, але дагэтуль яно зусім скончана. Да будаўніцтва вызначаных плянам яшчэ двух новых масларобчых заводаў дагэтуль не прыступілі.

Арганізацыя сьвіназводных калгасаў рабілася габінэтным шляхам. Ніякай растлумачальнай работы сярод калгаснікаў аб арганізацыі сьвіназводных гаспадарак не праводзілася. Ёсьць выпадкі, калі праўленьні калгасаў ня ведаюць, колькі сьвіноматак будзе ў арганізуемых гаспадарках.

Усе гэтыя факты былі выяўлены спэцыяльнай рабочай брыгадай, якая праводзіць зараз абсьледваньне малочнай каапэрацыі.

БРЫГАДЗІР.

Сыгналы гомельскіх рабкораў

У адным з папярэдніх лісткоў РСІ мы пісалі аб хваравітых зьявішчах, якія былі выяўлены рабочымі брыгадамі ў Гомельскім райсаюзе. Гомельскія рабкоры нам паведамляюць, што ў часе чысткі рамаёнаў ня была зьвернута належная ўвага на парсональную праверку спасобных супрацоўнікоў. Мы зварнем на гэта ўвагу Гомельскай АКК-РСІ.

Да адказнасьці апартуністых,

якія зрывалі работу з беднатой

Нядаўна Менскім аддзяленьнем Белкаапсаюзу быў праведзен масавы агляд работы 12 спажывецкіх таварыстваў акругі. Агляд, у якім прымалі ўдзел рабочыя брыгады, паказаў, што ў рабоце нізавых зьвеньняў спажывецкае сыстэмы ня ўсё добра. У часе агляду выяўлен рад фактаў скрыўленьня дырэктыў партыі, а таксама выпадкі самазабесьпячэньня, якое ўводзілася ў сыстэму некаторымі працаўнікамі каапэрацыі.

Найбольш характэрныя факты былі выяўлены ў Самахвалавіцкім спажывецкім таварыстве. У складзе праўленьня гэтага таварыства ня было ніводнага бедняка, батрака і рабочага. Ніякай работы в беднатой і батрацтвам за ўвесь час не праводзілася. Батрацка - бядняцкая група пры таварыстве існавала толькі на паперы. Праўленьне ашуквала вышэйшыя каапэрацыйныя і савецкія арганізацыі адносна каапэраваньня беднаты. На 1 е студзеня праўленьне прыслала весткі ў Менскае аддзяленьне аб поўным каапэраваньні батрацтва і беднаты ў той час, калі больш 60 бядняцкіх гаспадарак ня былі каапэраваны. Таксама не каапэраваны яшчэ і батракі. Каля 1.000 руб. з фонду каапэраваньня беднаты засталіся не скарыстанымі.

Плян арганізацыі грамадзкага харчаваньня ў саўгасах і калгасах раёну сарваны. Дырэктыва Менскага аддзяленьня аб адчыненьні сталовак у саўгасах Фаніпаль і Шыкатовічы дагэтуль ня выканана. Сталоўка ў мястэчку Самахвалавічы зусім не абсталявана, трымаецца ў брудным стане. Нічога не зроблена для набліжэньня крам да сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, ня гледзячы на тое, што ў радзе ёсьць 4 буйныя саўгасы і 6 калгасаў. З прычыны бязьдзейнасьці праўленьня былі сарваны і іншыя мерапрыемствы, як кантрактацыя жывёлы, заготоўка другараднага сырцу.

Пасасобныя члены праўленьня былі ў вельмі прыяцельскіх адносінах з кулакамі. У выслананага кулака быў куплен дом за 2.100 руб. Кошт дому значна перавышан.

Пры разьмеркаваньні дэфіцытных тавараў практыкавалася «ўраўнілаўка». Клябанская крама адпускала ўсім пайшчыкам па 500 грам цукру на кніжку. Грэчыская крама выдавала пшанічную муку ўсім жадаючым, бедната, батрацтва і рабочыя засталіся бяз мукі. Пшанічная мука (80 мяшкоў), атрыманая для ясель, дзіцячых пляцовак і больніцы, была пушчана на вышечку калача. Члены праўленьня забясьпечвалі сябе дэфіцытнымі таварамі. Жаночыя польты і плашчы былі разьмеркаваны выключна сярод членаў праўленьня і іх знаёмых.

Культурна - масавая работа зусім не праводзілася. Каля 2.000 руб. культфонду не скарыстаны.

Самахвалавіцкае спажывецкае т-ва ў даным выпадку зьяўляецца найбольш характэрным. Але ёсьць яшчэ шмат спажывецкіх т-ваў, дзе справа абстаіць не на многа лепш.

Справа Самахвалавіцкай каапэрацыі, а таксама Гомельскай і Полацкай, аб якіх мы ўжо пісалі, гаворыць аб тым, што наша спажывецкая каапэрацыя яшчэ не прыстасавалася для выкананьня задач, якія пастаўлены перад ёю партыяй.

Гэтыя факты высоўваюць зараз перад спажывецкай каапэрацыяй безадкладнае вырашэньне праблемы кадраў, перабудовы ўсёй работы на новых пачатках з прыцягненьнем да яе ўсёй грамадзкасьці. Партыйныя арганізацыі павінны аддаваць больш увагі рабоце спажывецкай каапэрацыі.

А. І.

Ад рэдакцыі: Па атрыманых намі вестках праўленьне Самахвалавіцкага т-ва ўжо перавыбрана. Былыя члены праўленьня прыцягваюцца да судовай адказнасьці

Рыбныя шкоднікі

Сотні тысяч рублёў дзяржаўных грошай пушчаны на вецер

Зараз пры вострым недахваце мясных прадуктаў рыбная гаспадарка набывае вялізнае значэньне. Ад правільнае яе арганізацыі часткова залежыць зараз бесьперабойнае забесьпячэньне пралетарскіх цэнтраў.

БССР па сваіх прыродных умовах мае вялікія пэрспэктывы для разьвіцьця рыбагадоўлі. На жаль, у нас не заўсёды, як належыць, выкарыстоўваюць добрыя прыродныя ўмовы для разьвіцьця гэтай галіны народнай гаспадаркі. Наадварот, ёсьць выпадкі, калі нават проста руйнуюць існуючыя рыбныя гаспадаркі, наносяць вялікія страты дзяржаве і зрываюць забесьпячэньне рабочых цэнтраў. Вось прыклады.

Пры саўгасе «Чырвоная Зорка» (Жыткавіцкі раён, Мазырскае акруга) ёсьць рыбная гаспадарка, якая з прычыны безгаспадарчасьці і нядбайнасьці яе кіраўнікоў Жыраненка, Буракова і Нікіфарава за апошнія гады амаль зруйнавана.

У 1929 годзе з прычыны нядбайных адносін і недагляду ў гаспадарцы прарвала дамбу, у выніку з аднэй сажалкі ўцякло каля 120.000 карпаў, вагою ў 1 кілёграм кожны. Кілёграм карпа на месцы тады прадавалі па 60 кап. Дзяржава, такім чынам, мела звыш 7.000 руб. страты.

Аднак, гэты агідны факт не паслужыў навукай для «рыбных спэцаў». Мінулым летам Нікіфараваў і Буракоў пачалі «пашыраць» гаспадарку шляхам пабудовы новых зімавальнікаў. Пабудова зімавальнікаў каштавала 100.000 руб. Будаўніцтва вялося без усялякага плану. З прычыны неарганізаванасьці работ і нераспарадчасьці—загадчыкам гаспадаркай Нікіфаравым было неправыдтакавана шмат грошай. Нарэшце, пад восень зімавальнікі былі пабудаваны. У зімавальнікі было пушчана 223.000 малькоў карпа. Вясной 1930 г. у красавіку пачалі лавіць малькоў. Першая лоўля ў 16 зімавальніку, куды было пушчана каля 31.000 малькоў, нічога не дала. Усе яны загінулі. У 12 зімавальніку, куды было пушчана 12.000 малькоў, вылавілі толькі 1.000. Рэшта таксама загінула. Наогул, у большасьці зімавальнікаў загінулі ўсе малькі. Так паляцелі на вецер сотні тысяч рублёў дзяржаўных грошай.

У справу ўмяшалася мясцовая партыйная арганізацыя. Выявілася, што «рыбныя спэцы» пачалі будаўніцтва зімавальнікаў, не зрабіўшы загадзя дасьледваньня глебы. Між тым, тут залягае жалезная руда, якая відна нават на паверхні. Але, «рыбныя спэцы» як быццам не заўважылі, што ў вадзе знаходзіцца жалезная руда, якая пагубным чынам уплывае на малькоў. Была тут праяўлена «забыўлівасьць» з боку «рыбных спэцаў», ці што-небудзь іншае—нехай скажуць пракуратура і пралетарскі суд.

ц.

Прамысловасьць БССР за 8 месяцаў

Ня гледзячы на тое, што каляндарны плян за 7 мес. ня выканан, май адзначае ўпад валавой прадукцыі на 3,8 проц., што нельга выключна прыпісаць памяншэньню колькасьці рабочых дзён, а належыць, галоўным чынам, прыпісаць таму факту, што да гэтага часу яшчэ ня зьвішчаны поўнасьцю тыя адм.-тэхн. недахопы, аб якіх прыходзілася гаварыць у мінулых аглядах.

Усяго за 8 м-цаў валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. складае 180 млн. руб., што, у параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году, дае павялічэньне на 69,5 проц. у той час, калі гадавы прырост за першае паўгодзьдзе складаў 72,1 проц. і за 7 мес.—70,4 проц.

У адносінах выкананьня прамфінпляну, вытворчая праграма за 8 м-цаў выкананa ў разьмеры 95,8 проц. Гадавы-ж плян за 8 мес. выкананa на 60 проц.

Па мэталяапрацоўчай прамысловасьці праграма выкананa на 92 проц. Ёсьць адступленьне ад пляну і па вытворчасьці хэмічнай кройды (на 5,3 проц.), дрэваапрацоўчай, галоўным чынам, па фанэрнай, шкляной, запалкавай і вытворчасьці буд. матар'ялаў мінэральнага паходжэньня.

Асабліва значнае невыкананьне пляну назіраецца па гарбарна-абутковай прамысловасьці, на якой праграма недавыкананa амаль што на 14 проц. Па аднэй абутковай прамысловасьці недавыпрацавана каля 200 тыс. пар абутку, або 15 проц. пляну.

Значнае адступленьне ад пляну дае фасфарытная прамысловасьць, якая на 1/VI выпрацавала 4.065 тон замест 12.000 тон, або 33,9 проц. каляндарнага пляну.

Па-ранейшаму значнае адступленьне ад пляну паказваюць харчовая прамысловасьць, пераважна, цукерная, тэкстыльная, галянтарэйная і вытворчасьць акуляраў.

У адпаведнасьці з плянавым заданьнем пакуль што працуюць швэйная, панчошна-трыкатажная, папяровая і махорачная.

У выніку недавыкананьня пляну прамысловасьць за 8 мес. недавыпрацавала прадукцыі больш, чым на 8,5 млн. руб.

Цікава адзначыць, што з улічаных 84 прадпрыемстваў, выкананьне як колькасных, так і якасных паказальнікаў наглядаецца толькі па 13 прадпрыемствах. Такая лічба дастаткова характэрна ў сэнсе ацэнкі ўдзелу паасобных прадпрыемстваў у выкананьні прамфінпляну па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці. Пераважная большасьць прадпрыемстваў працуе нездавальняюча.

Па-ранейшаму прыходзіцца канстатаваць ня зусім спрыяючыя паказальнікі з пункту погляду вытворчасьці ў адносінах зьмяненьня рабсілы, якая ўсё павялічваецца. Сярэдня-сутачная колькасьць рабочых на сьпісе, склаўшая за май месяц 46.860, у параўнаньні з папярэднім м-цам узрастае на 4,8 проц., а супроць мая 1929 г.—на 40,8 проц. Усяго за мінулыя 8 м-цаў сярэдня-сьпісачны лік рабочых складае 39.790 чал., што ў параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году паказвае рост на 30,7 проц. замест прадугледжанага плянам павялічэньня на 32 проц.

Найбольш сур'ёзным момантам у рабоце прамысловасьці трэба лічыць павялічэньне бягучасьці рабсілы.

Павялічэньне бягучасьці рабсілы ў значнай меры нагаршае якасны склад рабсілы і мае ўплыў на агульны ход разгортваньня прамысловасьці. Гэта досыць яскрава відаць хоць-бы з наступнай карэспандэнцыі (гл. «Полесск. Правду» ад 25 мая), якая аб павялічэньні абарачвальнасьці рабсілы па запалкавай ф-цы «Х Кастрычнік» піша:... «бягучасьць б'е на прамфінпляне... У той час, калі старая работніца здымкі дае 4 скрынкі запалак у дзень, навічок дае 2 і 1½...».

Сур'ёзным пытаньнем па-ранейшаму застаецца і ўкамплектаваньне прамысловасьці неабходнай кваліфікаванай рабсілай, прычым у значнай меры гэта тлумачыцца тым, што пытаньню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі рабсілы аддаецца мала ўвагі як з боку гаспадарчых, так і праф. арганізацый.

У адносінах прагулаў пасьля красавіка, які характарызаваўся значным ростам нявыхадаў на работу па няўважлівых прычынах, май цалкам па ўсёй прамысловасьці адзначае памяншэньне прагулаў (з 0,54 да 0,46), захоўваючы, аднак, для раду галін прамысловасьці вельмі нездавальняючае становішча (шкляная, мэталёвая, папяровая).

Рад матар'ялаў сьведчыць аб тым, што ў адносінах арганізацыі належнай працоўнай дысцыпліны карэннага пералому яшчэ няма. Адзінаначальне, ня гледзячы на наяўнасьць шмат дырэктыў, праводзіцца яшчэ слаба.

Май сыгналізуе аб няспрыяючых паказальніках у галіне прадукцыйнасьці працы. Дзенная выпрацоўка, у параўнаньні з сакавіком, дае ўпад на 4,2 проц. у той час, калі май мінулага году супроць папярэдняга мес. паказваў рост на 1,6 проц. У сувязі з гэтым прадукцыйнасьць працы за 8 мес. дае некаторае пагоршаньне паказальнікаў.

Як недапушчальны факт, трэба адзначыць невыкананьне плянавых памячэньняў па ахове працы. Апрача лічбовых матар'ялаў, якія сьведчаць аб тым, што асыгнаваньні на ахову працы скарыстоўваюцца ў вельмі нязначнай частцы, аб гэтым-жа вельмі сур'ёзна сыгналізуе наш заводзкі друк, якому мы і даем слова:

«На ф-ках ахова працы пастаўлена кепска, няма вэнтыляцыі... заводакіраўніцтва бездзядкана, бюракратычна адносіцца да паляпшэньня і аздараўленьня ўмоў працы. Замест адпушчаных 14 т. руб. выдаткавана ўсяго 2.000 руб.». (заводзкая газэта «Чырв. Бярэзіны»).

«Згодна апошняга акту праціспэктара высьвятляецца, што за 4 мес. не праведзен у жыцьцё рад мерапрыемстваў па ахове працы... з 59.000 руб., намечаных на 29-30 г. за першае паўгодзьдзе выдаткавана ўсяго каля 4.000 р.» (запалкавая ф-ка «Х Кастрычнік»—газ. «Полесская Правда» ад 7 чэрвеня).

Такіх прыкладаў шмат. У такіх безадказных адносінах да аховы працы ў значнай меры вінаваты як гаспадарчыя органы, так і нізавыя прафарганізацыі, якія недастаткова рашуча ставяць пытаньне аб выкананьні плянавых памячэньняў ў частцы аховы працы.

На фоне абвостранага становішча з сырцом зусім недапушчальнай зьяўляецца наяўнасьць раду арганізацыйна-тэхнічных недахопаў у справе карыстаньня і захаваньня сырцу. Рад фактаў сьведчыць аб тым, што нормы выдаткаваньня сырцу вышэй плянавых памячэньняў, аддзелы забесьпячэньня працуюць ня досыць выразна, складзкая гаспадарка знаходзіцца ў вельмі нездавальняючым становішчы. Нашы заводзкія двары прадстаўляюць сабою яшчэ «могілкі» вельмі каштоўных матар'ялаў. Усё гэта гаворыць аб тым, што ў адносінах арганізацыі складзкой гаспадаркі справа па-ранейшаму абстаіць вельмі дрэнна.

Да гэтага часу грамадзкасьць яшчэ не мабілізавана на барацьбу са стратамі.

Май ня прынёс карэннага пералому ў адносінах ходу вываз і сплаву лесаматар'ялаў. Апрача гэтага зварачае на сябе ўвагу нездавальняючая якасьць работы па сплаве, што атрымлівае свой адбітак у адсутнасьці сартоўкі лесу, што выклікае лішкавую працу на перасартаваньні і павялічвае сабекошт прадукцыі на заводах.

Сур'ёзным недахопам зьяўляецца вельмі марудная разгортваньне работы тарфяной прамысловасьці. **Усяго за май выканана 12 проц. сэзоннай праграмы замест неабходных 20 проц. Гэты вучастак работы прамысловасьці павінен прыцягнуць да сябе ўвагу ўсёй грамадзкасьці.**

Да гэтага часу далей гутарак мы ня ідзем у справе паляпшэньня якасьці прадукцыі. Май м-ц па-ранейшаму характарызуецца наяўнасьцю раду фактаў, якія сьведчаць аб дрэннай якасьці прадукцыі.

Зьніжэньне сабекошту ў красавіку дае меншы каэф., чым у сакавіку месяцы. Так, калі за сакавік зьніжэньне сабекошту без Лесбелу складае 11,1 проц., дык за красавік гэта лічба складае ўжо 10,8 проц. Усяго на супроцьстаўленым коле прадпрыемстваў (зноў такі без дрэваапрац. прамысловасьці) зьніжэньне сабекошту за 7 мес. складае 6,4 замест 11,5 проц. па пляне.

Па-ранейшаму найбольш буйное адставаньне ад пляну паказваюць бавоўняная прамысловасьць (фактычнае зьніжэньне—5 проц. замест 13,7 проц.), суконная (4,1 проц. супроць 14,6 проц.), гарбарна-абуткова (4,9 проц. замест 12 проц.), запалкавая (3,1 проц. супроць 12 проц.), дрэваапрацоўчая, якая замест зьніжэньня сабекошту ў 12 проц. у першым паўгодзьдзі, паказвае ўзрост сабекошту на 2,2 проц., і вытворчасьці акуляраў (11,3 супроць 20,5 проц. па пляне).

Ня гледзячы на тое, што май і ў асабліваści чэрвень зьявіліся паваротным пэрыядам у разгортваньні капітальнага будаўніцтва, усё-ж ёсьць яшчэ небясьпека няпоўнага выкананьня пляну капітальнага будаўніцтва.

Па-ранейшаму балючымі пытаньнямі ў прамысловасьці зьяўляецца масававытворчая праца і пытаньні арганізацыйна-тэхнічнага парадку.

Ня гледзячы на новы ўздым сац. спаборніцтва і рабочае ініцыятывы ў сувязі з самаправеркай і падрыхтоўкай да зьезду партыі, мы яшчэ маем рад недахопаў, якія перашкаджаюць большаму праяўленьню рабочае ініцыятывы. Апрача недапушчальных адносін да сац. спаборніцтва з боку адм.-тэхн. пэрсаналу, наглядаецца і слабая арганізацыя гэтага руху з боку праф. органаў.

Нездавальняюча працуюць вытворчыя нарады. Яшчэ маюць месца недапушчальныя факты нядбайных адносін да выкананьня рабочых прапаноў і рабочага вынаходніцтва.

Рэарганізацыя прамысловасьці яшчэ ня скончылася. Праверка дырэктыў аб пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак і дакладненьне прамфінпляну да варштатаў сьведчыць аб тым, што дырэктыва партыі па гэтым пытаньні выконваецца вельмі марудна.

Зварачае на сябе ўвагу дрэннае тэхнічнае кіраўніцтва. Наглядаецца рад фактаў, у прыватнасьці на мэталяапрацоўчай прамысловасьці, па якой часта прыходзіцца перарабляць гатовыя вырабы і мадэлі з-за няправільна-складзеных чарцяжоў.

* * *

Рэзюмуючы, трэба зноў канстатаваць, што май яшчэ больш павялічвае пагрозу недавыкананьня прамфінпляну.

Гэта са ўсёй рашучасьцю патрабуе ад рабочае клясы, ад усяго апарату прамысловасьці, усіх нізавых праф. і парт. арганізацый узьняць сваю арганізацыйна-тэхнічную работу на большую вышыню.

У гэтых адносінах рашаючым фактарам павінна стаць неадкладнае правядзеньне ў жыцьцё адозвы УсеЦСПС аб арганізацыі пэфства лепшых прадпрыемстваў над адстаючымі з тым, каб, узяўшы іх на «грамадзкі буксір», накіраваць іх на правільны шлях, які прывёў-бы да ліквідацыі прарыву і выкананьня пляну 2-га году пяцігодкі.

А. ШУЛЬМАН.

Як працуе саматужная каапэрацыя БССР

Вынікі абсьледваньня НК РСІ

Для абсьледваньня работы саматужна-прамысловай каапэрацыі БССР і тых прычын, якія перашкаджаюць выкананьню саматужнай каапэрацыяй задач забесьпячэньня рынку прадметамі шырокага спажываньня, НК РСІ БССР, ВСНГБ, і Белсампрамсаюз правялі абсьледваньне сыстэмы саматужна-прамысловай каапэрацыі.

Як вядома, адна з галоўных задач сыстэмы — аб'яднаць асобныя раскіданыя саматужныя вытворчасьці, абагульніць іх, уцягнуць у агульнае рэчышча сацыялістычнай гаспадаркі. Як выконвалася гэта задача? Лічбы паказваюць, што сыстэма распрацавала работу на ахопленне саматужнікаў. У 1928 г. было каапэравана 38.000 чалавек, у 1928-29 г. — 46.000 чал., у гэтым годзе павінна ахопіць каапэраваньня каля 61.000 чалавек. Калі параўнаць гэтыя лічбы з агульным лікам саматужнікаў БССР, дык трэба канстатаваць, што сыстэмай ахоплены ўсяльні 51 проц. саматужнікаў. Гэта лічба недастатковая, перад сыстэмай саматужнай каапэрацыі стаіць задача разгарнуць як мага шырэй гэту работу.

Недастаткова выкананы задачы каапэраваньня мястачковай і вясковай бедноты. Вясковы сэктар саматужнай каапэрацыі па БССР складае 26,8 проц. (усіх членаў), але саматужнікі вёскі ахоплены толькі на 7 проц. Найбольшы лік саматужнікаў каапэраваны ў Гомельскай і Магілёўскай акрузе, дзе ўдзельная вага каапэраваных саматужнікаў вёскі складае 47 проц. усіх членаў арцеляй. У іншых округах работа на вёсцы не разгорнута, ёсьць раёны, дзе вясковыя саматужнікі зусім не каапэраваны, ня кажучы пра тое, што існуе рад груп саматужнікаў, якія займаюцца пераапрацоўкай мясцовага сыр'ю. Звараччае на сябе ўвагу тое, што работа па ўцягненьні саматужнікаў у прамысловую каапэрацыю праводзіцца галоўным чынам у бліжэйшых да акруговага цэнтру раёнах, у мясцовасьцях, дзе ёсьць добрыя шляхі зносін. У асобных глыбінных пунктах каапэраваньне разгорнута вельмі слаба.

Асабліва дрэнна праводзіцца каапэраваньне у Магілёўскай акрузе, дзе, як выявіла абсьледваньне, удзельная вага вясковага сэктару зьніжаецца з 30 проц. у 1928 г. да 14 проц. у 1929-30 г., у сувязі з распадам раду арцеляй і на цяперашнім мер да забесьпячэньня арцеляй драўнінай.

Недастаткова ахоплен каапэрацыяй мястачковы сэктар, яго ўдзельная вага складае 33,1 проц.; слаба ахоплены бяднянка - серадняцкія масы мястэчка. Пры каапэраваньні мястачковых саматужнікаў мала ўвагі зварачалася на іх пераканфіскацыю, на скарыстаньне іх у пераапрацоўцы мясцовага сыр'ю.

Арцелі часта арганізоўваліся самацёкам без кіраўніцтва з боку сыстэмы каапэрацыі і без плану.

Слаба выконвалася дырэктыва аб характары і напрамку работы саматужнай каапэрацыі. Саматужная каапэрацыя павінна ўзяць курс, галоўным чынам, на пераапрацоўку мясцовага недэфіцытнага сыр'ю. Між тым, каапэраваньне, інша, галоўным чынам, за лік ахопу промыслаў, якія патрабуюць дэфіцытнага сыр'ю: па 1 кастрычніка 1928 г. на дэфіцытным сыр'ю працавала 51,5 проц. усіх членаў арцеляй, 1 кастрычніка 1929 г. — 59,9 проц., 1-га студзеня г. г. — 59,4 проц.

Побач з ростам сеткі саматужнай каапэрацыі расла агульная сума прадукцыі, якая выкідвалася саматужна-прамысловай каапэрацыяй на рынак. У 1927-28 годзе было выпрацавана прадукцыі на 16,7 мільёнаў руб., у 1928-1929 г. — на 34,8 мільёнаў, у 1929-30 годзе павінна быць выпушчана прадукцыі на 57,7 мільёнаў руб. Прадукцыя саматужнай каапэрацыі раўняецца 18,5 проц., прадукцыі дзяржаўнай прамысловасьці. Асабліва значную ролю адыгрывае саматужная каапэрацыя ў задавальненьні патрэб беларускага рынку, на які прыпадае каля 80 проц. усёй прадукцыі.

Як выконваўся прамфінплян? У 1928-29 годзе прамфінплян саматужнай каапэрацыі быў выканан толькі на 90 проц., прычым промыслы па пераапрацоўцы дэфіцытнага сыр'ю выканалі плян на 94,9 проц., а промыслы на недэфіцытным сыр'ю — на 81,4 проц. Асабліва дрэнна выконваўся плян па керамічнай вытворчасьці (32,5 проц.) — па тым промысле, на які, згодна пастановы ўраду, трэба было зьвярнуць асаблівую ўвагу. Такі-ж прыблізна характар мела выкананьне прамфінпляну ў першым - другім квартале 1929-30 году.

Гаворачы аб прамфінпляне, трэба падкрэсьліць, што **прамфінплян яшчэ не ўкараніўся ў сыстэму каапэрацыі. Значная частка арцеляй дагэтуль ня ведала аб існаваньні прамфінплянаў і не складала іх.** Не складалі плянаў і акруговыя саюзы. У некаторых арцелях ёсьць толькі квартальныя пляны, гадавых плянаў амаль нідзе няма. **Пытаньні сабекошту, пытаньні якасных паказальнікаў не знайшлі адбітку ў плянах.** Ня прыходзіцца гаварыць аб давядзеньні пляну да варштату саматужніка.

Трэба завастрыць увагу на **зьніжэньні сабекошту і якасьці прадукцыі.** Сыстэма саматужнай каапэрацыі мала што зрабіла, каб мабілізаваць масы саматужнікаў на барацьбу за паталеньне прадукцыі і паляпшэньне яе якасьці.

ЛІЎШЫЦ, БІРГЕР.

Якія новыя прадпрыемствы будуць адкрыты 11 ліпеня

ВСНГБ распрацаваў плян сьвяткаваньня 10-годзьдзя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў па прамысловасьці БССР.

На 7-гадзінны рабочы дзень пераводзяцца шпалерная фабрыка імя Вароўскага ў Менску, выдавецтва «Палесдрук» у Гомелі, фанэрны завод у Віцебску, алейня імя Адзярыхі ў Бабруйску, алейня імя Калініна ў Віцебску, алейня «Золак» у Магілеве, менскі завод «Энэргія», акулярная фабрыка ў Віцебску, іголачная фабрыка ў Віцебску і завод «Камунар».

У гэты дзень адбудзецца закладка цэлюлёзнага камбінату ў Бабруйску, заводу па апрацоўцы бульбы ў Бялынічах, абутковай фабрыкі ў Віцебску, мэханічнай гуты ў Гомелі, торфазаводу ў Тошчыцах і кіно-тэатру ў Воршы.

Акрамя таго, пры фабрыцы «Дзьвіна» будзе закладзен жыльлёвы дом на 50 кватэр, на Бабруйскім камбінаце — на 60 кватэр.

Пры заводзе «Чырвоная Зорка» ў Менску будуць адкрыты дзіцячыя ясьлі. Пры гэтым-жа заводзе будзе адкрыт рабочы клюб. Пры менскай цагельні № 8 будзе закладзен будынак рабочай сталоўкі.

ДА СЬВЯТКАВАНЬНЯ 10-ЦІГОДЗЬДЗЯ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БЕЛАРУСІ

У адзнаку 10-цігодзьдзя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, Менакрутком Мопр'у пастанавіў прысьвяціць да 11-га ліпеня агульна-гарадзкую інтэрнацыянальную экскурсію ячэек Мопр'у ў чырвонаармейскія лягеры (Ждановічы). Рыхтуецца спэцыяльная культурная і мастацкая праграма для экскурсіі.

На 13-е ліпеня арганізуецца мопраўская масоўка ў садзе «Прафінтэрн», дзе з дакладам выступіць прадстаўнік ЦК Мопр'у СССР. Пасьля дакладу адбудзецца інтэрнацыянальны канцэрт.

27 чэрвеня | САД ПРАЦАСЬВЕТЫ | 27 чэрвеня

Цэнтральны штаб садзейнічаньня эстафэце рэдакцыя «ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ» і АК ЛКСМБ наладжваюць УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР, прысьвечаны

АЎТА-МОТА-ВЭЛЁ-ЭСТАФЭЦЕ

ДА 16-га ЗЬЕЗДУ.

У праграме: Масавыя гульні, скокі, атракцыёны, сіняя блюза друкароў, струнны аркестр, іграюць два духавых аркестры.

Пачатак а 7-й гадзіне.

Білеты ў фабзаўкомах, РК ЛКСМБ і рэдакцыі «ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ».

УСЕ НА ВЕЧАР!

МЕНСК

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН УЛОВУ РЫБЫ

Эканамічная нарада БССР заслухала даклад аб ходзе лову рыбы. Нарада адзначыла, што плян улову сарваны па лініі Белрыбы і саматужнай каапэрацыі. У рабоце таварыства Белрыба ня было арганізаванасьці. Белсампрамсаюз слаба арганізоўваў рыбацкія арцелі, колькасьць іх дае магчымасьць ахапіць толькі палавіну ваданмаў, рыбакі не забясьпечаны сеткамі, ільготы рыбакам не растлумачаны.

Эканамічная нарада запрапанавала Белрыбе і Белсампрамсаюзу ўжыць меры да ахопу ўсіх ваданмаў. Белкалгасцэнтру даручана арганізаваць у калгасах рыбацкія брыгады. Белрыбе, акруговым і раённым выканкомам даручана ахапіць усіх рыбакоў-адзіночак дагаварамі. Белсампрамсаюзу запрапанавана арганізаваць арцелі па вязаньні сяцей.

АРГАНІЗАЦЫЯ ЦУКРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Эканамічная нарада прызнала магчымым арганізаваць у БССР цукровую прамысловасьць і пабудаваць першы цукровы завод у Брагіна-Хойніцкім раёне, Гомельскай акругі, дзе цукровасьць буракоў дасягае да 20 проц. Будаўніцтва заводу даручана Наркамгандалю.

ФАБРЫКА «КАСТРЫЧНІК» АДНАВІЛА ПРАЦУ

З 25 чэрвеня, пасьля месячнага перапынку, пачала працаваць швэйная фабрыка «Кастрычнік». На фабрыку паступіла 120 рабочых. Фабрыка пачала выраб зімовых жаночых польтаў. Арганізаваўся першы камсамольскі арэстат імя XVI партзьезду.

ГУРТКІ ПРАЎКІ ТАРЫ

У Віцебску, Гомелі, Бабруйску і Менску арганізаваны пры рабочых клюбах гурткі для праўкі старое тары (мяшкоў) у мэтах забесьпячэньня хлебазагатоўчай кампаніі.

КУРСЫ «ДВАЦЦАЦІПЯЦІТЫСЯЧНІКАЎ»

Пры ЦСПСБ і ўсіх акрпрафбюро арганізуюцца пятырамесячныя курсы для перанадрыхтоўкі рабочых «дваццаціпяцітысячнікаў».

УРАЧЫСТЫ ПЛЕНУМ ГАРСАВЕТУ

10-га ліпеня адбудзецца ўрачысты пленум Менгарсавету, прысьвечаны 10-годзьдзю вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

УКАМПЛЕКТАВАНЬНЕ АБВШ

На цэнтральныя курсы па падрыхтоўцы рабочых у АБВШ Менская інспэкцыя асьветы паслала 15 рабочых і калгасьнікаў.

З лістоў рабселькораў

ХТО ЗЬВЕРНЕ ЎВАГУ

Праўленьне МЦРК зварачалася да начальніка станцыі МББ (Менск) з просьбай, каб дровы, якія прыбываюць на станцыю, дастаўляліся непасрэдна на склады МЦРК. Начальнік у гэтым адмовіў. Тады праўленьне МЦРК хадайнічала перад чыгункаю, каб адпусьцілі некалькі клёмэтраў рэек з тым, што праўленьне МЦРК праложыць за свой кошт ветку. І ў гэтым ім адмовілі. Гэтае пачынаньне праўленьня сваячасова і неабходна. Надалей пакідаць разгрузку дроў на тым месцы, дзе чыгунка разгружае зараз, немагчыма, бо перавозка да складаў каштуе дорага, што, безумоўна, адбіваецца на рэальнай зарплаце рабочага.

Хто дапаможа МЦРК у вырашэньні гэтай справы?

І.

НЯ МЕСЦА ЁЙ У РВК

Дачка кулака Ганна Ліцьвін, якую выключылі з падрыхтоўчых курсаў і ўвесь час ня прымалі на ніякую работу, зараз апынулася ў Жыткавіцкім РВК і працуе ў якасьці справавода. Мы пытаемся: ці месца ёй у савецкім апараце? І чакаем адказу ад Жыткавіцкага РВК.

РЭЬУС.

ПЛАЧУЦЬ САЮЗНЫЯ ГРОШЫ

Нядаўна па прэзыдыуме Лепельскага гарсавету абмяркоўвалася пытаньне аб становішчы дзіцячага саду. Каб ахапіць дзетвару дашкольнага ўзросту беднаты гораду Лепеля патрэбны дадатковыя сродкі. Гарсавет зьвярнуўся па дапамогу ў Лепельскую прафарганізацыю. Райпрафпоўнаважаны тав. Рэзьнікаў адмовіў у просьбе гарсавету, матывуючы, «што грошай для гэтай справы ў нас няма». Амаль на той-жа дзень было адпушчана на юбілей драмгуртку пры мясцкоме саўгандальслужачых 60 руб. Дзіўна, дзе-ж узяў грошы райпрафпоўнаважаны? Мабыць, па думцы Рэзьнікава юбілеі карысьцей чымся дзіцячы сад.

ІСАКАЎ.

Улік аб'ектаў с.-г. падатку па Гомельшчыне праходзіць нездавальняюча

Мясцовыя органы недаацэньваюць важнасьці кампаніі

Улік аб'ектаў абкладаньня, які зараз праходзіць, мае вялізнае палітычнае значэньне, бо ад правільнага праведзеньня ўліку залежыць клясавае разьмеркаваньне падатку, ажыцьцяўленьне ільгот, якія прадстаўлены калгасам і асобным гаспадаркам. Адначасова з улікам праходзіць выяўленьне кулацкіх гаспадарак для абкладаньня іх у індывідуальным парадку і складаньня сьпісаў беднаты для поўнага вызваленьня ад падатку.

Абсьледваньне работы па ўліку ў Гомельскай акрузе зусім яскрава паказвае, што ўлік у акрузе праходзіць нездавальняюча, без дастатковай увагі, а часамі пры недаацэнцы яго палітычнага значэньня з боку асобных райкомаў партыі, вясковых ячэек і райвыканкомаў.

Ёсьць выпадкі ўтойваньня ад уліковых камісій сапраўднай плошчы пасеву. Не вядзецца выстарчальная барацьба з кулацкай агітацыяй за ўтойваньне пасеўнае плошчы, у выніку, паводле картак уліку, мы маем скарачэньне пасеўнае плошчы ў Хойніцкім, Гомельскім і Брагінскім раёнах. У сапраўднасьці пасеўная плошча не скарацілася, нават павялічылася.

Зусім не адпавядае сапраўднасьці ўлік жывёлы. Работа сельскіх улікавых камісій часта зводзіцца да мэханічнага запісваньня заяў сялян. На сходах заявы не правяраюцца, утойшчыкі не штрафуюцца.

Асноўная бяда — **растлумачальная работа па падатку праведзена нездавальняюча, а ў некаторых вёсках зусім ня было яе.**

Недаўлічаны незямляробчыя заработкі, якія хутка павялічваюцца, у сувязі з ростам нашага будаўніцтва і лесазагатовак.

Вялікая палітычная задача — выяўленьне кулакоў і абкладаньне іх у індывідуальным парадку. Гэта справа можа быць забясьпечана толькі пры ўмове прыцягненьня да яе парт'ячэек, груп сходаў беднаты і калгасьнікаў. Ніто мы маем у гэтай галіне? У Рэчыцкім раёне гэта работа амаль не пачыналася, Нова - Барсукоўскі сельсавет пастанавіў: «У нашым сельсавеце кулакоў няма», Уваройскі сельсавет прадстаўляе да індывідуальнага абкладаньня 5 гаспадарак, без абгаварэньня на сходзе беднаты. У Гомельскім раёне ўнесьлі ў сьпісы індывідуальна абкладзеных серадняцкую гаспадарку, бо «гаспадар да рэвалюцыі быў царкоўным старастай». Такі-ж факт меў месца ў Брагінскім раёне. Побач з гэтым ёсьць факты недаўліку кулацкіх гаспадарак.

У радзе сельсаветаў ёсьць факты зьмяншэньня пры ўліку колькасьці вызваленых бядняцкіх гаспадарак. **Трэба катэгарычна забясьпечыць поўнае вызваленьне ад падатку беднаты і маламоцных гаспадарак. Побач з гэтым павінны быць прыняты ўсе меры для дачы скідак, ільгот за правядзеньне агра і зоамінімуму, за пашырэньне пасеўнага кліну, чырвонаармейцам і г. д.**

Абсьледваньне трох раёнаў — Брагінскага, Хойніцкага і Рэчыцкага паказала, што сыстэма ўпоўнаважаных па сельсаветах існуе толькі на паперы. Упоўнаважаныя не выяжджалі, або былі ў сельсаветах толькі 2-3 дні. Зразумела, што сельсаветы ніякай дапамогі не атрымалі.

На жаль, зусім слаба кіруе кампаніяй Гомельскі акрфа. Страхагенцтва зусім не займаецца справай уліку. Рэчыцкі РВК абвясьціў вымову раённаму страхагенту Ламаносаву.

Мясцовыя арганізацыі, РВК, сельсаветы павінны выправіць неадкладна ўсе памылкі. **Трэба рашуча змагацца са спробамі абкладаньня сераднякоў у індывідуальным парадку.** Ні ў якім разе нельга дапусьціць паўтарэньня памылак мінулага году.

АЙЗІНСОН.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. А 7-й гадз. веч. адбудзецца вечар партыйнага і камсамольскага актыву чыгуначнікоў. Дакл. тав. **Саевіча** аб нацпалітыцы. Пасьля мастацкае аддзяленьне.

Кастрычн. РК МОПР'у. А 7-й гадзіне веч. нарада жакта'ўскіх ячэек МОПР'у Кастрыч. РК МОПР'у. Прысутнасьць членаў бюро абавязкова. Запрашаецца мопраўскі актыў.

Дом Асьветы. А 7 гадз. веч. адбудзецца сход калектыву ЛКСМБ. Яўка камсамольцаў абавязкова.

Палітэхнікум. А 7 г. веч. у памяшк. Палітэхнікуму (аўд. 2) адбудзецца сход усіх студэнтаў усіх аддзяленьняў палітэхнікуму і вячэрняга рабочага тэхнікуму, якія знаходзяцца у Менску па пытаньні аб удзеле студэнтаў у падрыхтоўцы да прыёму ў 1930-31 навуч. годзе. Яўка абавязкова.

БДУ. А 7 г. веч. у актавай залі (стары будынак) адбудзецца агульны сход студэнтаў Фак. саўбуду і права. У парадку дня: даклад аб задачах студэнтаў у час вакацыі і практыкі і вынікі вытворчай практыкі.

ЗАЎТРА

БДУ. Прафком наргасу паведамляе студэнтаў, ад'яжджаючых у лягеры і на летнія вакацыі, якія маюць патрэбу ў матар'яльнай дапамозе, павінны падаць заяву не пазьней 28 чэрвеня прафкому.

Вайсковы габінэт БДУ. Студэнты ўсіх факультэтаў першых курсаў (мужчыны і жанчыны), якія не прайшлі практычных заняткаў (вокамерных здымкаў) па тапаграфіі павінны прайсьці гэтакія 28 чэрвеня а 8 г. 15 м. раніцай. Збор у вайсковым габінэце. Студэнтам, якія ня пройдуць здымкаў, будзе ануляваны тэарытычны залік па тапаграфіі.

ЖАКТ № 4. А 6 з пал. гадз. веч. у памяшканьні Дому Асьветы адбудзецца агульны сход членаў Жакту № 4. У парадку дня: даклад брыгад, выбары праўленьня і рэвіз. кам. жакту. Яўка абавязкова. Пасьля выбараў — канцэрт.

Саюз Белпрацасьветы. Экскурсія па маршруту Менск — Ленінград, якая была вызначана 2 ліпеня, згодна атрымнага паведамленьня ад ЦК саюзу, перанесіцца на 15 ліпеня. Удзельнікі экскурсіі павінны зьявіцца ў Менск 15 ліпеня.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Фрунз. РК КП(б)Б склікае нараду куставых аб'яднаньняў па садзейнічаньні калектывізацыі вёскі. У парадку дня: чарговыя задачы шэфства, падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі і бягучыя справы. На нараду павінны зьявіцца наступныя куставыя аб'яднаньні саюзаў: харчавікоў, друкароў, швэйнікаў, дрэваапрацоўшчыкаў, тэкстыльшчыкаў, нарсувязі, будаўнікоў, транспартнікаў, камунальнікаў, нархарч і мэталістых. Нарада адбудзецца ў памяшк. РК а 6-й гадз. веч.

Менакрсавет саюзу валўнічых бязбожнікаў паведамляе, што 30-га чэрвеня а 7-й г. веч. у памяшк. Цэнтральнага Дому Селяніна адбудзецца нарада актыву бязбожнікаў г. Менску, на якую запрашаюцца ўсе сакратары ячэек бязбожнікаў, апоргі і старшыні рэвкамісіі, а таксама і тыя т. т., якія прымалі актыўны ўдзел у антырэлігійнай прапагандзе.

Аддзел разьмеркаваньня ЦК КП(б)Б просіць зьявіцца ў ЦК (пак. № 6) тав. **Бурсьцін** Рэгіну, па яе асабістай справе.

П. Т. ЦКК КП(б)Б паведамляе, што на пасяджэньні 2-га ліпеня г. г. а 6 з пал. гада. увечары будуць разглядацца справы наступных т. т.:

Раскінда, В. А.; Бойко, Міхаіл Рыгорава; Адлера, Віктара Майсеева; Левіна, Абрама Барысава; Сухаверава, Алеся Кандратава; Левіна, Самуіла Хаімава; Крупіча, Алеся Цімохава; Ханчына, Меера Калманава; Дабравіцкага, Шая Гіршава; Новікава, Міколу Карнеева; Прэсмана, Якава Ніпхусава; Цукера, Макса Абрамава; Іонтава, Ісака Лейбавіча; Мэтара, Майсея Абрамава; Гурэвіча, Ізраіля Іоселева; Курылюка, Харытона Клімава; Ігнатовіча, Міхаіся Арцамава; Кісялёва, Аляксея Антонава; Хэйфіца, Хаіма Ільліча; Дзербава, Віктара Антосева; Чэкуро, Емельяна Ахрэмава; Лабаноўскага Рыгора Самуілава; Выдрэвіча, Льва Яхімава; Жулего, Сямёна Цярэнкава; Сгурскага, Цярэнція Мартынава; Сідаровіча, Рамана Рыгорава; Левіна Шынмана Ехмелевіча; Гурскага Апанаса Язэпава; Ігнатковіча, Фёдара Міхайлава.

Памянёныя т. т. запрашаюцца для ўдзелу пры разглядзе іх спраў. Таксама запрашаюцца старшыні праверкомаў і сакратары ячэек, дзе гэтыя т. т. лічацца на вучоце і знаходзяцца ў Менску.

Праезд за свой кошт.

ДА АСЕНЬНЯГА ПРЫЁМУ У ВНТУ

БЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ

(гор. Менск, Земляробчы зав., д. № 4)

АБВЯШЧАЕ,

што ў 1930-31 навучальным годзе будуць існаваць наступныя факультэты.

1. Хэміка-тэхналёгічны з аддзяленьнямі:
а) харчовае,
б) сілікатнае,
в) тарфянае,
г) лесамэханічнае.

2. Мэханічны з аддзяленьнямі:
а) халодная апрацоўка мэталяў,
б) варштатабудаўніцтва,
в) лесамэханічнае,
г) першапачатковая апрацоўка валакністых матэрый.

3. Электратэхнічны з аддзяленьнямі:
а) прамысловая электрафікацыя,
б) сельская электрафікацыя,
в) электрастанцыі.

4. Будаўнічы з аддзяленьнямі:
а) фабрычна-заводзкае будаўніцтва,
б) калгаснае будаўніцтва,
в) жыльлёвае будаўніцтва,
г) дарожнае будаўніцтва,
д) санітарнай тэхнікі.

Прыём першай чаргі будзе адбывацца ў жніўні месяцы.

I. На хэміка-тэхналёгічны факультэт:
1. Харчовая спэцыяльнасьць (перапрац. с.-г. прадукцыі . . 30 чал.
2. Сілікатная спэцыяльнасьць (шкло) . . . . . 15 чал.
3. Тарфяная спэцыяльнасьць (хэміка-прам. перапрацоўка торфа) . . . . . 15 чал.
Усяго . 60 чал.

II. На мэханічны факультэт:
1. Варштатабудаўніцтва . . . 15 чал.
2. Халодная апрацоўка мэталяў 15 чал.
3. Мэханічная апрацоўка валакністых матэрый . . . . . 20 чал.
Усяго . 50 чал.

III. На электратэхнічны факультэт:
1. Прамысловая электрафікацыя . . . . . 15 чал.
2. Сельская электрафікацыя . 15 чал.
Усяго . 30 чал.

IV. На будаўнічы факультэт:
1. Фабрычна-заводзкае будаўніцтва . . . . . 30 чал.
2. Калгаснае будаўніцтва. . 15 чал.
3. Санітарнай тэхнікі . . . 15 чал.
Усяго. 60 чал.

Агулам . 200 чал.

Заўвага: Наступныя прыёмы вызначаны ў сьнежні і сакавіку і аб іх будзе абвешчана асобна.

У лік студэнтаў інстытуту прымаюцца асобы, не маладзей поўных 17 год на 1-га жніўня 1930 году.

Асобы, якія жывуць на непрацоўныя даходы або пазбаўленыя выбарчых праў і іх утрыманцы ў інстытут ня прымаюцца.

Жадаючыя паступіць у інстытут падаюць аб гэтым заяву з абавязковым паказаньнем факультэту і спэцыяльнасьці, на якіх яны хочуць вучыцца.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы:
а) дакумант аб узросьце (мэтрыка),
б) дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын),
в) дакумант аб адукацыі,
г) дзьве фатаграфічныя карткі,
д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага,
е) дакумант аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі,
ж) даведка, засьведчаная вязавой савецкай арганізацыяй аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых праў,
з) для сялян—акладны ліст, або засьведчаная копія з яго, па сельска-гаспадарчым падатку на 1929-30 г., а для саматужнікаў—адпаведны дакумант аб падатку на 1929-30 г.
і) анкета, засьведчаная прафэсыянальнымі і савецкімі арганізацыямі, прычым адказнасьць (згодна Крымінальнага Кодэксу) за направільнасьць вестак нясуць асобы, даўшыя весткі і засьведчыўшыя анкету.

УВАГА: 1. Ніякія копіі дакумантаў ня прымаюцца (за выключэньнем дакумантаў аб адносінах да вайсковай службы).

УВАГА 2. Да заявы неабходна прыкласьці паштовыя маркі на 20 кап. для адказу яе падавальніку.

Прыём заяў адбываецца з 1-га ліпеня па 20 ліпеня. Ніякія заявы пасьля гэтага тэрміну ня прымаюцца.

Прыёмовыя іспыты будуць адбывацца з 1-га па 10-га жніўня. Залічэньне ў студэнты будзе адбывацца да 20 жніўня. Рэзультаты прыёму будуць абвешчаны да 1 верасьня.

Ад прыёмовых іспытаў вызваляюцца: усе скончаўшыя рабфакі, курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВНТУ, прафшколы і фабзавучы на базе 7-годкі, тэхнікумы, 9-годку, агульнаадукацыйныя 2-гадовыя курсы на базе 7-годкі, а таксама і вытрымаўшыя прыёмовыя іспыты пры паступленьні ў ВНУ ў 1928-29 і 1929-30 годзе. Гэтыя асобы падлягаюць выключна клясаваму адбору.

УВАГА I. Усе іншыя асобы (скончаўшыя школы для дарослых навышэйшага тыпу, агульнаадукацыйныя курсы і прафшколы не на базе 7-годкі, або 7-гадовую працоўную школу, а таксама і ня маючых афіцыйных дакумантаў аб асьвеце павінны трымаць экзамэн у аб'ёме курсу рабфаку.

УВАГА II. Скончаўшыя прафшколы і фабзавуч на базе 7-годкі і тэхнікумы, павінны прадставіць даведку аб сваім вытворчым стажы.

УВАГА III. Курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВНТУ вызваляюць ад экзамэнаў пры паступленьні, калі пасьведчаньні, выданыя аб пасьпяховым скончэньні курсаў, падпісаны органам Наркамасьветы.

УВАГА IV. Вызваленыя ад прыёмовых іспытаў не павінны прыяжджаць да атрыманьня пісьмовага паведамленьня аб сваім залічэньні.

Агульны справачнік з паказаньнем дакладных правілаў прыёму, праграм, формы анкет і г. д. ёсьць у продажы ў магазынах Белдзяржвыдавецтва.

Пры інстытуце арганізавана справачнае бюро для дачы розных справак па пытаньнях прыёму. Спраўкі выдаюцца кожны дзень з 3-х да 5 гадзін дня.

Пачатак заняткаў на хэміка-тэхнічным факультэце — 1 верасьня, а на іншых—1 кастрычніка.

Анкеты для паступаючых можна атрымаць у канцылярыі інстытуту.

Беларускі Палітэхнічны Інстытут.

Група супрацоўнікаў БДВ выказвае сваё шчырае спачуваньне т. МАРУКУ Яну Нічыпаравічу з прычыны трагічнай сьмерці яго жонкі

ІРЫНЫ КАНСТАНТЫНАЎНЫ

Часова выконваючы абавязкі рэ-дактара А. Мітлін.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Гастролі 1-га Маскоўскага пересовечнага тэатру ОПЭРЫ і БАЛЕТУ
Сёньня, 27 чэрвеня „АЙДА" муз. Верды
Білеты ў касе тэатру і раб. насе.
ПАЧАТАК А 9 ГАДЗ. 30 М.
АНОНС! У нядзелю, 29 чэрвеня „РУСАЛКА" ранішны спэктакль

Кіно-тэатр „Культура" — Мастацкая гэраічная кіно-паэма ЗМОВА МЕРТВЯЦОЎ у 7 частках. Галоўныя ролі выконваюць: Ангельскі генэрал—Д. Гутмон, здраднік—П. Кузьняцоў, Й. Пятроў, В. Таскін, Е. Чарвякоў. Белы афіцэр—Сямёнаў і інш. З сэансу. Пач. 1-й 7 г. 30 м., 9 г. і 10 г. 30 м. КАСА ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — З ПРЫЧЫНЫ ПОСЬПЕХУ 2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі нямецкі фільм „ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК" Пачатак 1-га сэансу а 7-й гадз. Каса ад 5 г.

КІНО САД (Савецкая, 71) — ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ МЁРТВАЯ ПЯТЛЯ драма ў 8 частках. У галоўных ролях: Жэні Юго, Вориэр КРАУС. Пачатак 1-г с. а 9 г. Каса адкрыта ад 6 г.

КІНО Піалетарый — Мастацкі замежны фільм ЧЫКАГА драма ў 8 ч. У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: Філіс Хевер і Бікітор Верконі. ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 7 ГАДЗ. Каса—ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — ПРЫГОДЫ АРЫШКІ у 6 частках. Пачатак 1-га сэансу а 2 гадзіне. Каса ад чынена з 12 гадзін.

Кіно „СПАРТАК". Ад панядзелка, 23-га чэрвеня выдатны бытавы фільм ТРЫПОЛЬСКАЯ ТРАГЭДЫЯ у 7-мі частках. УВАГА: Сёньня 4 сэансы. Пачатак 1 с.—8 г. 30 м., 2 с.—8 г., 3 с.—9 г. 30 м., 4 с.—11 г. КАСА—ад 5 гадз. 30 м.

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА ВА ўсіх КНІГАРНЯХ БДВ І ВА ўсіх КРАМАХ СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ

М. ЧУКОЎСКІ.—Расійская Амэрыка. Стар. 96. Цана 35 к.
З. БЯДУЛЯ.—Тры пальцы . . Стар. 86. Цана 35 к.
П. ЛОГІНАЎ-ЛЯСЬНЯК.—Спадчына. Стар. 158. Цана 65 к.
А. ГУСЕЎ.—Бацькі і дзеці. . Стар. 74. Цана 30 к.
С. КАЧАТКОЎ.—Пад царом. . . Стар. 109. Цана 35 к.
О. ДРОЖДЖЫН.—Вялікія і грозныя зьявы прыроды . Стар. 87. Цана 35 к.
КРАПІВА.—Ухабы на дарозе. . Стар. 43. Цана 20 к.

Белдзяржвыдавецтва.

27 чэрвеня г. г. а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні дэтсаду Жакту № 2 (Ленинская 14) АДБУДЗЕЦЦА АГУЛЬНЫ СХОД СЯБРОЎ-ЖЫХАРОЎ Жакту № 2.
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Справаздача праўленьня. 2. Выбары ізберкому. 3. Бягучыя справы.
Праўленьне.

Мяняю пакой у Бабруйску, у цэнтры гораду на пакой у Менску. Зварачвацца: Лепінская, 12 кв. 5 з 4 з паловай гадз. дня да 7 гадз. КАГАНУ.

ЦП саюзу саўгандальслужачых 30-га чэрвеня склікае агульны сход работнікаў МЦРК у памяшканьні клюбу н-саюзу з наступным парадкам дня: 1) Даклад РСІ аб выніках чысткі апарату МЦРК. 2) Выбары таварыскага суду.
Для працуючых на другой вячэрней зьмене сход адбудзецца а 12 гадз. дню, а для працуючых на 1-й дзённай зьмене — а 8 з палов. гадз. увечары.
Яўка усіх прадаўніноў МЦРК абавязкова.

Механік па рамонце швэйных машын і сьлесар шукае працы. Зварачацца ў м. Глуск, Бабруйскай акр., НЭЙМАНУ М. М.

ПАСЬПЯШАЙЦЕСЯ З ПАДПІСКАЙ на 2-е ПАЎГОДЗЬДЗЕ 1930 г. (ліпень-сьнежань)
НА СТАРЭЙШУЮ ШТОДЗЕННУЮ ГАЗЭТУ—ОРГАН ЦК КП(б)Б „ЗЬВЯЗДА"
Усе матар'ялы, справаздачы і рэзалюцыі XVI ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ будуць цалкам зьмяшчацца на старонках газэты „Зьвязда".
Усе падпісчыкі газэты „ЗЬВЯЗДА" дармова атрымліваюць дадатак Орган ЦСПСБ „ПРАФРУХ БЕЛАРУСІ" Орган ЦСПСБ
Падпісная цана на „ЗЬВЯЗДУ" з дадаткам „ПРАФРУХ" застаецца ранейшая: 6 мес.—5 р., 3 мес.—2 р. 60 к., 1 мес.—90 кап.

АБВЕСТКА. Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян, што абмен часовых лісткоў выданых замест пастаянных кніжак, ПРАЦЯГНУТ ДА 1-га ЛІПЕНЯ. Пасьля паказанага тэрміну лісткі анулююцца. Абмен праводзіцца кожны дзень у стале заборных кніжак (пл. Волі, 14) з 9 г. раніцы да 9 г. веч.
Праўленьне ЦРК.

УСЕ НА ПРОВАДЫ ЭСТАФЭТЫ. ДА ЎВАГІ ЯЧЭЕК АЎТОДОРУ. 28-га чэрвеня, а 12 гадз. дня з пл. Волі даецца старт аўта-мота-вэлё-эстафэты МЕНСК-МАСКВА. Усе ячэйкі Аўтадору павінны вылучыць вэлё